РЭЦЭПТЫ ШЧАСЦЯ НА ЭКРАНЕ 5

ЖАЛЕЗНЫ АРГУМЕНТ, КАБ КУПІЦЬ ДРУГУЮ ХАТУ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

+TVПРАГРАМА

8 КРАСАВІКА 2022 г. ПЯТНІЦА № 68 (29690)

КАРАТКА

• На перыяд майскіх свят Беларуская чыгунка прызначыла 75 дадатковых цягнікоў.

• Фізасобы ў Беларусі ў сакавіку прадалі на $244 млн валюты больш, чым купілі.

• У КДК з'явіўся нумар 191 для паведамленняў аб парушэннях у час пасяўной.

• У ветэрынарных урачоў Беларусі з'явіцца прафесійнае свята.

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар ЛУЦКІ, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Трэба быць максімальна сабранымі, аб'ектыўна ацэньваць абстаноўку. Санкцыі для нас — гэта і магчымасці: адны рынкі закрытыя, іншыя адкрываюцца. Самае важнае — своечасова пераарыентавацца. Мы вырабляем тое, што трэба людзям: тавар якасны, прадукцыя добрая — і гэта знойдзе свайго спажыўца. Падчас санкцыйнага ціску і нестабільнай абстаноўкі ў свеце ўзрастае роля грамадскіх арганізацый. Трэба ісці ў калектывы і размаўляць з людзьмі, тлумачыць цяжкасці, якія ўзнікаюць. Іх трэба пераадольваць разам, згрупаваўшыся. Ніякія байкоты, забастоўкі нам лепш не зробяць. Мы павінны ісці наперад: гадаваць дзяцей, вырабляць прадукцыю. Толькі тады будзе дзяржава. Нам трэба прыкладаць усе намаганні для захавання краіны, жыць і працаваць менавіта на гэтай зямлі. На мой погляд, патрыятызм узрастае ад цэнтра да ўскраін. Тут людзі жывуць і працуюць на зямлі, яны гатовы стаяць за гэтую зямлю».

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«НА ПЕРАГАВОРАХ ПАВІННА ГУЧАЦЬ ПАЗІЦЫЯ БЕЛАРУСІ»

Уплыў міжнароднай сітуацыі на айчынную эканоміку і перагаворы аб міры ва Украіне
Прэзідэнт Беларусі абмеркаваў з Саветам Бяспекі, губернатарамі і міністрам эканомікі

Нарады з сілавым блокам у Палацы Незалежнасці з-за ваеннага канфлікту каля айчынных меж праходзяць апошнім часам нярэдка. Учора размова ішла не толькі на ваенныя тэмы. Асноўны ўхіл быў зроблены на такі складнік бяспекі любой дзяржавы, як эканоміка. Але, адкрываючы размову, кіраўнік краіны спыніўся на іншых тэмах і патлумачыў сваё бачанне першапрычын канфліктаў ва Усходнееўрапейскім рэгіёне.

«Глабальна гэта супрацьстаянне Злучаных Штатаў Амерыкі і Кітая»

Бягучую сітуацыю на знешнім контуры і яе ўплыў на сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі Аляксандр Лукашэнка назваў адным з найбольш актуальных пытанняў для дзяржавы, якое стаіць у адным шэрагу з забеспячэннем ваеннай бяспекі.

«Нам неабходна ацаніць, як складваецца абстаноўка ў краіне, у свеце і якія тэндэнцыі прасочваюцца. Якія высновы з гэтага трэба зрабіць, на што скіраваць намаганні, якія практычныя крокі зрабіць. Разгледзім і асноўныя напрамкі знешнепалітычнага курсу нашай краіны ў гэтых няпростых умовах. ***Эканамічная вайна супраць Беларусі вядзецца ўжо амаль два гады. З улікам падзей ва Украіне наступленне на нас пайшло па ўсіх франтах,*** як я кажу, за кампанію: у гандлі, фінансах, лагістыцы», — сказаў Прэзідэнт.

Ён акцэнтаваў, што галоўная мэта ціску — перакрыць экспартныя каналы, аслабіць праз імпартныя абмежаванні, каб у канчатковым выніку гэта адбілася на дабрабыце насельніцтва. Па словах кіраўніка краіны, хуткасць прыняцця санкцый, а таксама глыбіня іх прапрацоўкі сведчаць аб тым, што яны рыхтаваліся даўно.

«Пры гэтым зразумела, што іх увялі б незалежна ад развіцця расійска-ўкраінскіх адносін. Санкцыі былі б. Мы зацыкліліся на частцы праблемы ў сусветным маштабе. ***Санкцыі супраць Расіі, супраць нас, канфлікт ва Украіне, глабальна — гэта супрацьстаянне Злучаных Штатаў Амерыкі і Кітая.*** Як тут з Кітаем разабрацца, калі блытаецца пад нагамі гігант у выглядзе Расіі?! Ды яшчэ і Беларусь далучылася?! Праходзячы міма, вырашаючы глабальную праблему пераўладкавання свету (з'явіўся новы магутны гулец — Кітай), спрабуюць разабрацца з Расіяй і Беларуссю. ***Будзе вельмі дрэнна, калі саюз Беларусі і Расіі не вытрымае»,*** — сцвярджае Прэзідэнт.

Фота БелТА.

«Мы ведалі, што будзе. І спрабавалі прыняць меры»

Паводле Аляксандра Лукашэнкі, у цэлым наша краіна рыхтавалася да падобнага развіцця падзей, і пра гэта ён папярэджваў яшчэ з пачаткам пандэміі.

«Нагадаю, я вам тады сказаў: мы не ведаем, ці рукатворная гэта пандэмія альбо не, але што наступствы яе будуць вельмі складаныя — гэта дакладна. Так і адбылося. ***Я папярэдзіў усіх, што размова ідзе аб перадзеле свету. Сёння пра гэта хто толькі не гаворыць. Мы ведалі, што будзе. І спрабавалі прыняць меры. Важную падтрымку нам аказвала, асабліва ў эканамічным плане, Расія»,*** — успомніў Прэзідэнт.

Ён расказаў, што і ў час нядаўняга візіту ў Маскву з Прэзідэнтам Пуціным яны таксама разгледзелі пытанні ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва ў прамысловасці, грузаперавозках, паліўна-энергетычнай і фінансавай сферах.

«Галоўнае — мы аднолькава ацэньваем сітуацыю, якая склалася вакол Беларусі і Расіі. Для нашых краін сапраўды адчыняюцца новыя «вокны» магчымасцяў. З зыходам заходніх кампаній з рынку Саюзнай дзяржавы вызваліліся вялікія нішы, якія нам трэба будзе асвоіць. Пытанне ў тым, што нам перашкаджала гэта рабіць раней — лабісты, канкурэнцыя, карупцыя? Верагодна, усё ў цэлым. Многія краіны, якія рушылі за моцнымі гэтага свету і бяздумна далучыліся да санкцый, ужо пачынаюць задумвацца і нешта разумець. Некаторыя заходнія кампаніі пабеглі, асобныя вяртаюцца назад. Частка і не сыходзіла, а толькі зрабіла пра гэта заявы», — канстатаваў кіраўнік краіны.

СТАР. 2

Фота БелТА.

Лічбавы свет

ПРАГРАМАВАННЕ — ПЕРШАЯ ПРАФЕСІЯ

Як паглыбіць веды па інфарматыцы і знайсці першае рабочае месца яшчэ ў школе?

Два касмічныя апараты спрабуюць сесці на паверхню Месяца. Пасадачная капсула набліжаецца да яе з пэўнай хуткасцю. Яна таксама прыцягваецца планетай і, каб не дапусціць яе падзення, выкарыстоўваецца тармазны рухавік. Для ажыццяўлення мяккай пасадкі на хуткасці не больш як 2 метры ў секунду трэба аўтаматычна, па распрацаваным алгарытме, задаваць расход паліва на чарговую секунду палёту. Выйграе гулец, які здзейсніць мяккую пасадку за найменшы час. Нічыя магчымая ў двух выпадках: або абедзве капсулы разбіліся, або яны селі адначасова. Распрацаваць алгарытмы і напісаць праграмы для вырашэння гэтай задачы, пазмагацца з імі за перамогу прапануюць удзельнікам анлайн-турніру па гульнявым праграмаванні «Місія: Месяц». Турнір — гэта частка адукацыйнага праекта «Праграмаванне — першая прафесія», у аснове якога ляжыць навучанне праз гульню.

СТАР. 4

«НА ПЕРАГАВОРАХ ПАВІННА ГУЧАЦЬ ПАЗІЦЫЯ БЕЛАРУСІ»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Па сутнасці, гэтыя абмежавальныя меры ў адносінах да Расіі і нашай краіны, уведзеныя ЗША і іх саюзнікамі, у выніку становяцца санкцыямі для ўсяго свету, робяць слабейшымі дзяржавы, якія іх уводзяць, дадаў Прэзідэнт.

«Вазьміце Еўрапейскі саюз. Не хапае паліва, падскочылі цэны, не хапае харчавання. Сельская гаспадарка вельмі насцярожылася, бо недастатковa мінеральных угнаенняў», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, зачапілі санкцыі і Кітай, бо гэта «асцярожная краіна» таксама пачынае актыўна выступаць супраць абмежаванняў.

Прэзідэнт не сумняваецца, што з пачаткам расійскай спецаперацыі ва Украіне завяршылася цэлая гістарычная эпоха — ва ўмовах абвастрэння супрацьстаяння вядучых гульцоў імкліва фарміруецца новы «водападзел» паміж Усходам і Захадам. Аляксандр Лукашэнка лічыць: каб выйсці на сутыкненне з Кітаем, ЗША неабходна было разабрацца з Еўропай і Расіяй.

«І пачалося гэта як мінімум з майдана. Не апошняга, а папярэдняга перад ім. Неабходна было з Украінай і Беларуссю разабрацца, каб потым разбірацца з Расіяй. Ва Украіне ў выніку двух майданаў што адбылося, вы ведаеце. Наступнымі былі мы. У 2020 годзе паспрабавалі, зламалі рогі і зубы — не атрымалася, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Спецыяльная ваенная аперацыя Расіі на Украіне паслужыла спускавым кручком, каб пачаць антырасійска-беларускую аперацыю, якая працягваецца. Далей будзе Кітай, таму ён так захвалёваўся».

«Галоўнае, каб быў вынік»

Па словах Прэзідэнта, у гэтай сітуацыі выбар Беларусі быў відавочны: пасля выяўлення бясспрэчных фактаў аб рэальнай пагрозе нацыянальнай бяспецы своечасова былі прыняты ўсе неабходныя меры для абароны сваёй краіны, абсалютна правамерна задзейнічаны механізм ваеннай падтрымкі ў рамках Саюзнай дзяржавы.

«Больш за тое, амаль адразу пасля пачаткі актыўнай фазы баявых дзеянняў на тэрыторыі Украіны Беларусь традыцыйна пастаралася наладзіць дыялог паміж бакамі канфлікту. ***Для тых, хто крычыць «Не вайне»: нам гэта вайна не патрэбна, бо ў выніку канфлікту больш за ўсіх можам пацярпець мы. Мы чарговы раз прапанавалі Расіі і Украіне камфортную і бяспечную пляцоўку для перагавораў. Наша ініцыятыва была імі пачутая і з удзячнасцю прынятая.*** У Беларусі ўжо прайшлі тры сустрэчы расіян і ўкраінцаў», — нагадаў кіраўнік краіны.

Аднак прафесійныя дзеянні нашых вайскоўцаў і дыпламатаў засталіся незаўважанымі на Захадзе, сцвярджаў Прэзідэнт.

«Ім не патрэбна была міратворчая місія ў Беларусі. Па задуме я вам сказаў: яны ў адзін кошык нас склалі з Расіяй і вырашылі заадно разабрацца. Ну якая міратворчая пляцоўка ў Беларусі, трэба, напрыклад, у Стамбуле — у краіне НАТА», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго, апаненты не хацелі бачыць Беларусь міратворчай пляцоўкай і таму прапанавалі Стамбул. «Мы не настойваем. ***Хай там праводзяць гэтыя перагаворы. Галоўнае, каб быў вынік. Бяздоказна і беспадстаўна Беларусь была абвешчана «памагатым агрэсара» — якія ж тады ў нас перагаворы?! А ўслед за гэтым неадкладна рушылі чарговыя санкцыі»,*** — дадаў Прэзідэнт.

Ён на нарадзе ўпершыню абазначыў пазіцыю Беларусі ў дачыненні да перагавораў па Украіне. Яна гучыць наступным чынам: ***«Не можа быць перагавораў без удзелу Беларусі.*** Калі вы нас увязалі ў гэта (найперш заходнія краіны), на перагаворах павінна гучаць пазіцыя Беларусі. Мы выходзім не з таго, што нас у адзін кошык з Расіяй пасадзілі, а з таго, што гэта вайна — за плотам нашай краіны і яна сур'ёзным чынам уплывае на сітуацыю ў Беларусі. ***Таму ніякіх за спінай Беларусі сепаратных дамоўленасцяў быць не можа. Я перакананы, што Расія такую пазіцыю разумее.*** Але гэта будзе супярэчыць задуме Захаду», — паведаміў Прэзідэнт.

Ён мяркуе, што, калі Украіна зойменца аднаўленнем сваёй краіны, Захад не будзе бескарыслівa дапамагаць.

«Яны калі і будуць будаваць нейкі завод — гэта будзе не ўкраінскага народа завод, а той краіны, якая будзе аднаўляць. Небяспечна, што ва Украіне нічога не застанецца ўкраінскага. Нават алігархічнага. Усё будзе падмята алігархамі Злучаных Штатаў Амерыкі і буйных краін Еўрапейскага саюза», — разважаў Аляксандр Лукашэнка.

Таму ён чарговы раз прапанаваў тром славянскім народам нарэшце сесці за стол перагавораў і дамовіцца на роўных.

«Шчасце трэба шукаць у сябе. Як я даўно казаў: тры славянскія народы павінны нарэшце, усвядоміўшы тое, што адбываецца ў свеце ў глабальным плане, сесці за стол і дамовіцца. Дамовіцца на роўных», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Пакутуйце, як хочаце, але пастаўлена адна задача — эканоміка»

Беларусь і далей будзе жорстка адстойваць свае нацыянальныя інтарэсы, сказаў Прэзідэнт. ***«А саюзнікі, якія пакуль яшчэ сумняваюцца, павінны зразумець: без найхутчэйшага згуртавання нашай «цывілізацыі», без умацавання палітычных, эканамічных і ваенных сувязяў нас заўтра можа ўжо і не быць. Таму ў цяперашняй сітуацыі разам з безумоўным развіццём сувязяў з дружалюбнымі дзяржавамі вельмі важна адшукваць і прасоўваць перспектыўныя напрамкі, актыўна выкарыстоўваць, я сказаў бы, «кропкавую дыпламатыю», дасягаць канкрэтных вынікаў»,*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, ад эфектыўнасці работы эканомікі ва ўмовах гандлёвай і фінансавай блакады з боку Захаду і правільна расстаўленых знешнепалітычных прыярытэтаў у многім залежыць і ўнутрыпалітычная стабільнасць дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што на нарадзе хацеў бы пачуць адказы на пытанні: як урад ацэньвае бягучую эканамічную сітуацыю і якія пагрозы праглядаюцца на найбліжэйшую і сярэднетэрміновую перспектыву, якія ёсць рэзервы для супрацьстаяння санкцыям і якая агульная стратэгія ўрада.

«Ах, складаная сітуацыя! Цяжкасці і праблемы! ***Ніякіх цяжкасцяў і праблем няма, акрамя дзвюх-трох пазіцый.*** Таму няма чаго пакутаваць. Але можаце пакутаваць. Я гэта перш за ўсё кажу эканамічнаму блоку і ўраду. Вы пакутуйце, як хочаце, але пастаўлена адна задача — эканоміка», — сарыентаваў Прэзідэнт.

Яго цікавіла і наколькі эфектыўна рэалізуюцца беларуска-расійскія дамоўленасці аб узаемнай падтрымцы ў сувязі з жорсткім ціскам Захаду, і якія неабходныя дадатковыя меры? Гэта яго хвалюе з нагоды хуткай сустрэчы з кіраўніцтвам Расіі.

Яшчэ адно пытанне нарады — якія карэктывы неабходна ўнесці ў знешнепалітычную дзейнасць, якія неадкладныя меры прыняць з улікам істотнай змены сітуацыі вакол нашай краіны і наяўных прагнозаў?

Адказваць на іх пачаў **прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА.** Першы яго тэзіс: у цэлым эканоміка вытрымлівае ціск санкцый — прадпрыемствы працуюць, людзі занятыя і своечасова атрымліваюць заробкі.

«ВУП склаўся на ўзроўні 101,2 працэнта. Прадукцыйнасць працы павялічылася на 3,8. Складскія запасы мінімальныя. Экспарт тавараў за два месяцы вышэйшы, чым у мінулым годзе, на 21,5 працэнта, — паведаміў кіраўнік Саўміна. — Станоўчае сальда знешняга гандлю склалася на ўзроўні плюс 700 мільёнаў долараў ЗША. Нядрэнныя фінансавыя паказчыкі прадпрыемстваў. Чысты прыбытак узрос больш чым у тры разы. Рэнтабельнасць продажаў перавысіла 9 працэнтаў. Захоўваецца дысцыпліна плацяжоў. Захавана дынаміка росту рэальных даходаў насельніцтва».

Прэзідэнт тут заўважыў, што ёсць добрыя прадпрыемствы, але ёсць тыя, што працуюць дрэнна. На апошнія Аляксандр Лукашэнка мяркуе звярнуць асаблівую ўвагу і паглядзець, што ім перашкаджае.

«Гэта ў асноўным невялікія прадпрыемствы, што ствараюць неабходную на рынку прадукцыю. І па сыравіне для іх няма праблем, значыць, дзесьці недапрацоўваем, расслабіліся», — дадаў кіраўнік краіны.

Прэм'ер канстатаваў, што з сакавіка санкцыі значна павялічыліся, уведзены дадатковыя гандлёвыя, фінансавыя абмежаванні. «У выніку рэзка ўзрос негатыўны ўплыў на нашу эканоміку. Да гэтага закрыты і ўкраінскі рынак як для тавараў, так і для транспарту. Уведзена забарона экспарту ў Еўрасаюз калійных угнаенняў, нафтапрадуктаў, прадуктаў дрэваапрацоўкі і шэрагу іншых сектараў. Абмежаваны высокатэхналагічны імпарт інвестыцыйных тавараў. Шэраг банкаў адключаны ад сістэмы SWIFT», — заявіў Раман Галоўчанка.

Кіраўнік краіны імкнуўся патлумачыць: асноўнае з пералікі прэм'ера — страчаны ўкраінскі рынак, асабліва ў плане лагістыкі.

«Дайшло да таго, што нягоднікі сталі захопліваць нашых людзей. Перадусім кіроўцаў аўтамабіляў. Яны арыштавалі 1500 вагонаў, захапілі нашы аўтамабілі і да 100 нашых чалавек, якія кіравалі фурамі. Я папярэджваў украінцаў, што мы вымушаны будзем правесці спецыяльную аперацыю па вызваленні гэтых людзей. Такую спецыяльную аперацыю мы правялі і нашых людзей вызвалілі», — заявіў Прэзідэнт.

Па яго словах, яна застанецца без падрабязнасцяў, але ўсіх удзельнікаў загадаў прадставіць да ўзнагарод.

«Калі ў нас там пару чалавек недзе засталіся, неабходна жорстка паставіць умовы. Няхай Макей (кіраўнік МЗС. — **«Зв.»**) размаўляе з паслом Украіны. Калі іх не вызваляць, будзем размаўляць па-іншаму. Яны шмат чым рызыкуюць. Бо і тут нямала на чале з паслом украінцаў. Мы ж да іх адносімся па законе і па-чалавечы», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ Каментарый у тэму

Уладзімір МАКЕЙ, міністр замежных спраў Беларусі: «Сёння важна выпрацоўваць адэкватныя меры рэагавання на цяжкасці, і ўсяму дзяржаўнаму механізму трэба працаваць зладжана, накіроўваючыся на выкананне задач, што ставяцца Прэзідэнтам і ўрадам. Мы бачым, што размова зараз ідзе не пра Украіну, а пра глабальны перадзел свету. Асобныя краіны спрабуюць зразумець, што адбудзецца, і думаюць аб будучым светаўладкаванні. Можна зразумець логіку Расіі, вялікай дзяржавы, якую спрабуюць выкінуць на ўзбочыну сусветнага жыцця. Гэта непрымальна. Таму можна зразумець, што Расія прымае пэўныя намаганні па забеспячэнні сумленнага светаўладкавання. Мы зацікаўлены, каб крызіс у суседняй Украіне як мага хутчэй спыніўся і было забяспечана спакойнае развіццё дзяржавы. Мы гатовы зрабіць максімум для гэтага».

Міністр адзначыў, што Беларусь гатова ўнесці свой пасільны ўклад і ў перагаворны працэс аб міры ва Украіне.

«Мы ўпэўнены, што інтарэсы і гарантыя бяспекі павінны быць прадугледжаны не толькі ў адносінах да Украіны і Расіі, але і Беларусі як аднаго з трох славянскіх народаў, зацікаўленых у тым, каб тут былі мір і стабільнасць. Няважна, дзе адбудуцца заключныя сустрэчы. Але тое, што кіраўнік нашай краіны павінен удзельнічаць у гэтых перагаворах, — наша адназначнае меркаванне», — заявіў Уладзімір Макей.

Фирменное наименование эмитента
(полное наименование, включая организационно-правовую форму):
Открытое акционерное общество
«Лукомльэнергомонтаж»

Местонахождение эмитента
(индекс, почтовый адрес, телефон, факс (с междугородным кодом):
211162, Витебская обл., Чашникский р-н, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, д. 8, 8 (02133) 60273

Информация об акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 1 января 2022 г.

4. Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %): 0.

Вид собственности	Количество акций, шт.	Доля в уставном фонде, %
коммунальная всего	0	0
В том числе	x	x

5-6. Информация о дивидендах и акциях:

Показатель	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Количество акционеров, всего	лиц	59	60
в том числе: юридических лиц	лиц	1	1
в том числе: физических лиц	лиц	58	59
Обеспеченность акции имуществом общества	рублей	128,03	152,70
Количество акций, находящихся на балансе общества, – всего	штук	52	765

Акции, поступившие в распоряжение общества			Акции, приобретенные в целях сокращения общего количества	
Дата зачисления акций на счет «депо» общества	Количество акций, шт.	Срок реализации акций, поступивших в распоряжение общества	Дата зачисления акций на счет «депо» общества	Количество акций, шт.
			16.09.2021	52

7. Отдельные финансовые результаты деятельности открытого акционерного общества:

Показатель	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	7202,00	7412,00
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы; расходы на реализацию	тысяч рублей	7297,00	7129,00
Прибыль (убыток) до налогообложения – всего (Прибыль (убыток) отчетного периода)	тысяч рублей	-206,00	353,00
в числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	-95,00	283,00
прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	тысяч рублей	-111,00	70,00
Налог на прибыль; изменение отложенных налоговых активов; изменение отложенных налоговых обязательств; прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода); прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	тысяч рублей		64,00
Чистая прибыль (убыток)	тысяч рублей	-206,00	289,00
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток	тысяч рублей	203,00	546,00
8. Среднесписочная численность работающих	человек	84	96

9. Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг (только в составе годового отчета): **42210 Строительство трубопроводов – 87,57 %.**

10. Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой баланс за отчетный год: **25 марта 2022 г.**

Дата подготовки аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности: **24 марта 2022 г.**

Наименование аудиторской организации (фамилия, собственное имя, отчество (если таковое имеется) индивидуального предпринимателя), местонахождение (место жительства), дата государственной регистрации, регистрационный номер в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей: **Общество с ограниченной ответственностью «Белроссаудит»; 220020, г. Минск, пр-т Победителей, 89, к. 3, пом. 4; 28.08.2000 г. № 600506719.**

Период, за который производился аудит: **2021 г.**

Аудиторское мнение о достоверности бухгалтерской отчетности, а в случае выявленных нарушений в бухгалтерской (финансовой) отчетности – сведения о данных нарушениях: **Бухгалтерская (финансовая) отчетность достоверна во всех существенных аспектах отражает финансовое положение ОАО «Лукомльэнергомонтаж» на 31.12.2021 г., а также финансовые результаты его деятельности и изменение его финансового положения, в том числе движение денежных средств, за год, закончившийся на дату, в соответствии с законодательством Республики Беларусь.**

Дата и источник опубликования аудиторского заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности в полном объеме: **29.03.2022 г. ЕПФР.**

13. Сведения о применении открытым акционерным обществом Свода правил корпоративного поведения (только в составе годового отчета): **«Свода правил корпоративного поведения» – применяется.**

Директор П.В. Глазко

Гл. бухгалтер А.В. Круподер

УНП 300007839

ЗАО «БелБанкротАукцион»,
организатор торгов по продаже имущества
ГОУП «Лечебно-производственные (трудовые) мастерские»
(УНП 500055202), объявляет о проведении **19.04.2022 г.**
в 09.00 публичных торгов в электронной форме
на электронной торговой площадке bankrottorg.by

Перечень предметов торгов публично размещен по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2022/04/spisok-imushhestva-lptm.pdf

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел.: +375 29 882 39 23, +375(29) 866-10-00 Наталья Николаевна.

Продавец: ГОУП «Лечебно-производственные (трудовые) мастерские».

Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее **18.04.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **08.04.22** по 17.00 **18.04.22** организатором торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета публичных торгов в электронной форме, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор – 7 % от цены реализации предмета торгов.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение двадцати рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение двадцати рабочих дней с даты проведения электронных торгов.

У ПАСТАЯННАЙ ГАТОЎНАСЦІ

Падчас чарговага вучэння ратавальнікі тушылі пажар, выцягвалі з вады людзей і машыну, а таксама шукалі тых, хто згубіўся ў лесе

Пакуль супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях даставалі з возера ў вёсцы Старына, што ў Мінскім раёне, патанулы аўтамабіль і рыбака, які кінуўся на дапамогу кіроўцу і сам апынуўся ў вадзе, у Цэнтр аператыўнага кіравання МНС паступіў новы сігнал. Непадалёк ад гэтага ж вадаёма ўспыхнуў пажар — гарэў лес.

Пажарныя прыбылі аператыўна. У такіх выпадках важная кожная хвіліна. Гэта разумеюць і супрацоўнікі лясгаса: пакуль на месца здарэння ехала пажарная тэхніка, для таго каб не дапусціць распаўсюджвання агню, трактар пачаў абворваць зямлю. Ратавальнікі ўключыліся ў работу — і пажар быў паспяхова ліквідаваны. Тым часам высветлілася, што ў лесе згубіліся людзі, у тым ліку дзеці: спалохаўшыся агню, яны кінуліся ў гушчар, у выніку заблудзіліся. Ва ўзаемадзеянні з Міністэрствам лясной гаспадаркі і органамі ўнутраных спраў супрацоўнікі МНС пачалі пошукава-ратавальную аперацыю.

Людзей, безумоўна, знайшлі. На шчасце, пацярпелых падчас узгарання не было. З экасістэмай — таксама ўсё ў парадку. Надзвычайнае здарэнне ў вёсцы Старына нават не трапіла ні ў адну зводку МНС. А ўсё таму, што і лясны пажар, і надзвычайнае здарэнне на вадзе, і тыя, хто заблукаў у лесе, — справа рук саміх ратавальнікаў: нягледзячы на пажаранебяспечную абстаноўку ў краіне, планавыя вучэнні ніхто не адмяняў.

Тэмы вучэнняў падказваюць самі людзі, а канкрэтна — сітуацыі, у якія яны часцей за ўсё трапляюць. З наступленнем вясны, як правіла, пачынаецца пажаранебяспечны перыяд. Як толькі ўстанаўліваецца сухое надвор'е, людзі пачынаюць прыводзіць у парадак свае прысядзібныя тэрыторыі. Пры гэтым спальваюць смецце і леташнюю траву. У большасці выпадкаў такое «навядзенне парадку» на зямлі заканчваецца пажарам. Па стане на ўчарашні дзень толькі на тэрыторыі Мінскай вобласці зарэгістравана 1086 пажараў у прыродных экасістэмах. Асноўнымі прычынамі ўзгаранняў традыцыйна з'яўляюцца неасцярожнае абыходжанне з агнём, выпальванне сухой травяной расліннасці. І праблема ў тым, што людзі ніяк не могуць усвядоміць, што травяныя палы імгненна распаўсюджваюцца, асабліва ў ветранае надвор'е. Самастойна спыніць агонь чалавек ужо не ў сілах.

— Ратавальнікі Мінскай вобласці штодзённа выязджаюць на ліквідацыю надзвычайных сітуацый, і, вядома, каб быць у пастаяннай гатоўнасці, мы адпрацоўваем навыкі на занятках і вучэннях, — адзначыў **начальнік Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Сяргей ЛАПАНОВІЧ.** — На гэтым планавым вучэнні адпрацаваны тры ўводныя: ліквідацыя наступстваў дарожна-транспартнага здарэння, пажару ў экасістэме і пошук людзей, якія згубіліся ў лесе. Толькі летась нам паступіла больш чым сто паведамленняў аб грамадзянах, якія згубіліся. Нам пастаянна даводзіцца адточваць свае навыкі. Шчыльна працуем з міністэрствамі лясной гаспадаркі, унутраных спраў, узаемадзейнічаем з валанцёрамі. Ужо сёлета зафіксаваны тры выпадкі пошуку людзей у лесе. З пачатку года толькі на Міншчыне адбылося звыш тысячы пажараў у экасістэмах, на якіх загінулі два чалавекі.

Як заўважыў Сяргей Лапановіч, вучэнні, якія праводзяцца, максімальна набліжаны да тых праблем, якія ёсць: у першую чаргу аналізуюцца паведамленні ад насельніцтва, якія паступаюць у МНС. Пачынаецца дачны сезон, людзі наводзяць на сваіх участках парадак, спальваюць сухую расліннасць, спрабуюць запаліць у печы, але не заўсёды, паводле яго слоў, гэта атрымліваецца зрабіць бяспечна.

І ў такім выпадку ёсць некалькі сцэнарыяў развіцця падзей. Усе з іх акурат падчас падобных вучэнняў адпрацоўваюцца ратавальнікамі. Абавязкова — ва ўзаемадзеянні з супрацоўнікамі міліцыі, медыкамі, леснікамі, дарожнікамі, электрыкамі і іншымі кампетэнтнымі спецыялістамі. І менавіта зладжаныя дзеянні сапраўднай каманды прафесіяналаў дапамогуць справіцца не толькі з умоўным здарэннем, але і з сапраўднай надзвычайнай сітуацыяй.

Вераніка КАНЮТА,
Мінскі раён.

Фота Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.

Блізкая ўлада

Выканкамы на сувязі

Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.

Тэлефонныя лініі ў суботу, 9 красавіка, з 9.00 да 12.00 правядуць:

• першы намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Валянцін Міхайлавіч ЗАЙЧУК. Тэл. 8 016 221 31 21;

• намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір Пятровіч ПЕНІН. Тэл. 8 021 222 22 22;

• намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;

• намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Іосіфавіч ДЗЯШКО. Тэл. 8 015 273 56 44;

• намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч МАСЛАЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;

• старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля Віктараўна ЯКУБІЦКАЯ. Тэл. 8 017 500 41 60;

• старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Яўгенавіч КУХАРАЎ. Тэл. 8 017 222 44 44.

Надвор'е

І ЗНОЎ МОКРЫ СНЕГ

Пасля невялікага пацяплення ў нядзелю ўначы — замаразкі

Надакучыла ўжо гэтае ветранае надвор'е да чорцікаў. А калі з неба ў твар яшчэ кідае мокрым снегам — усё, наогул на вуліцу не хачу. А пакуль умовы надвор'я ў нашай краіне будуць вызначаць атмасферныя франты ад цыклону з цэнтрам над Балтыйскім морам, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У пятніцу будзе воблачна з прасяненнямі. На большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу, удзень месцамі з мокрым снегам. Уначы і раніцай у асобных раёнах краіны чакаецца слабы туман. Вецер паўднёвы, раніцай і ўначы з парывамі на заходні парывісты, раніцай і ўдзень у многіх раёнах моцны парывісты. Тэмпература паветра мінімальная ўначы ад плюс 4 да 9 градусаў цяпла, удзень — 8—13 са знакам плюс. Атмасферны ціск уначы будзе слаба падаць, удзень расці.

У суботу надвор'е ў нашым рэгіёне абумовіць франтальная сістэма, якая ссоўваецца з боку поўдня Польшчы. Воблачна з прасяненнямі. На большай частцы тэрыторыі нашай краіны пройдуць дажджы. Вецер паўднёва-заходні, заходні парывісты. Тэмпература паветра ўначы ад нуля да плюс 6 градусаў, удзень будзе ўжо значна цяплей — ад плюс 7 градусаў да 14 цяпла.

Чарговая змена надвор'я чакаецца 10 красавіка. Менавіта ў нядзелю наша тэрыторыя будзе знаходзіцца ў полі паніжанага атмасфернага ціску. Таму ўначы па ўсходзе, а ўдзень у заходніх раёнах Беларусі адаб'ецца ўплыў атмасферных франтоў.

Будзе воблачна з прасяненнямі. Уначы пераважна па ўсходняй палове, а ўдзень у асноўным у заходніх раёнах краіны чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Вецер заходні, паўднёва-заходні ўмераны, месцамі парывісты. Тэмпература паветра ўначы месцамі нізкая ад мінус 2 градусаў да плюс 5, удзень — 6—11 градусаў вышэй за нуль.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Большасць амерыканцаў выказалася за тое, каб Байдэн сышоў

Каля 52 працэнтаў амерыканцаў лічыць найлепшым для ЗША, калі прэзідэнт Джо Байдэн пазбавіцца ўлады. Аб гэтым сведчаць вынікі апытання, якое правёў вашынгтонскі Інстытут дэмакратыі сумесна з Sunday Express. Яно прадэманстравала, што амаль дзве траціны амерыканцаў (62 працэнты) лічаць, што Джо Байдэна ў 2024 годзе не перавыберуць. У той жа час, калі Дональд Трамп выставіць сваю кандыдатуру, ён вернецца да ўлады, мяркуюць рэспандэнты, паведамляла Daily Express. З 1,5 тысячы апытаных, якія назваліся «верагоднымі выбаршчыкамі», 57 працэнтаў негатыўна ставяцца да прэзідэнцтва Джо Байдэна. Пры гэтым 70 % лічаць, што Злучаныя Штаты рухаюцца ў «няправільным напрамку». «Знешнепалітычныя правалы Байдэна, перш за ўсё катастрафічны сыход Амерыкі з Афганістана, адштурхнулі ад яго выбаршчыкаў, і яны цяпер у большасці сваёй негатыўна ставяцца да таго, як прэзідэнт спраўляецца з роляй ЗША ў сусветных справах», — заявіў дырэктар Інстытута дэмакратыі Патрык Башам.

Прэзідэнт Емена перадаў уладу кіруючаму савету

Абд Рабу Мансур Хадзі перадаў уладу прэзідэнцкаму кіруючаму савету на пераходны перыяд па выніках міжеменскіх перагавораў у Эр-Рыядзе. Аб гэтым паведаміла еменскае агенцтва навін «Ас-Саба». Удакладняецца, што новае ведамства возьме на сябе абавязацельствы прэзідэнта і яго намесніка, таму кіраўнік Емена папрасіў віцэ-прэзідэнта Алі Махсэн аль-Ахмара пакінуць пасаду. Па даных агенцтва, кіраўніком савета прызначаны Рышад Мухамед аль-Алімі. У яго склад ўвайшлі яшчэ сем чалавек. У прыватнасці, пляменнік былога прэзідэнта краіны Тарэк Салех і кіраўнік сепаратысцкага Пераходнага савета Паўднёвага Емена Айдарус аз-Зубейдзі, які кіруе на поўдні Емена. Галоўная функцыя савета, па словах прэзідэнта, — аб'яднанне ўзброеных сіл Емена пад нацыянальным камандаваннем і спыненне расколу і канфліктаў у краіне.

Заходняя Афрыка перажывае найцяжэйшы харчовы крызіс

Колькасць тых, хто мае патрэбу ў надзвычайнай харчовай дапамозе, павялічылася з 2015 года амаль у чатыры разы — з 7 млн чалавек да 27 млн — у такіх краінах, як Буркіна-Фасо, Нігер, Чад, Малі і Нігерыя. Эксперты папярэджваюць, што гэтая колькасць можа вырасці да 38 млн да чэрвеня, калі ў хуткім часе не будуць прынятыя меры, каб дапамагчы людзям у Сахелі, шырокім рэгіёне на поўдзень ад пустыні Сахара. «Вытворчасць збожжавых у некаторых частках Сахеля скарацілася прыкладна на трэць у параўнанні з мінулым годам. Запасы ежы для сем'яў заканчваюцца. Засухі, паводкі, канфлікты і эканамічныя наступствы пандэміі COVID-19 вымусілі мільёны людзей пакінуць сваю зямлю, падштурхнуўшы іх да краю прорвы», — адзначыў рэгіянальны дырэктар Oxfam па Заходняй і Цэнтральнай Афрыцы Асалама Давалак Сідзі. Паводле яго слоў, цэны на прадукты харчавання ў Заходняй Афрыцы выраслі на 30 працэнтаў.

ПРАГРАМАВАННЕ — ПЕРШАЯ ПРАФЕСІЯ

Свядомы выбар

— ІТ-галіна сёння вельмі прыцягальная і для абітурыентаў, і для іх бацькоў. І не сакрэт, што даволі часта прафесійны выбар робяць за маладога чалавека яго маці і бацька, не задумваючыся пра тое, што будзе далей. Але ІТ-прафесіі, як, уласна кажучы, і любыя іншыя, патрабуюць свядомага выбару, наяўнасці пэўных здольнасцяў, разумення таго, чаму ты будзеш навучацца і чым займацца пасля заканчэння вучобы. А вось з гэтым ёсць праблемы, — расказвае **загадчык кафедры тэлекамунікацыйных і інфармацыйных тэхналогій факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій Белдзяржуніверсітэта Юрый ВАРАТНІЦКІ.** — Для праграмавання патрабуецца наяўнасць сістэмнага мыслення, уменне пабудаваць алгарытм, уявіць, як будзе працаваць праграма, спачатку ў сябе ў галаве. Я шмат гадоў чытаў праграмаванне на першым курсе і бачыў, што частка студэнтаў не ў стане яго асвоіць. Значыць, ім будзе цяжка падчас вучобы і ў іншых абласцях ведаў, якія патрабуюць такіх здольнасцяў. Лепш адразу спыніцца, задумацца і ні ў якім разе не падтрымліваць пазіцыю бацькоў «ну калі ўжо паступіў, то атрымай спачатку дыплом, а там разбяромся». Калі становіцца нецікава і незразумела, студэнт выпадае з агульнага адукацыйнага кантэксту, прапускае заняткі, і нічым добрым такая гісторыя не заканчваецца.

Па словах Юрыя Варатніцкага, адукацыйны праект «Праграмаванне — першая прафесія» — гэта сумесная ініцыятыва Навукова-тэхналагічнай асацыяцыі «Інфапарк» і факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій БДУ. Праект накіраваны на стварэнне комплекснай сістэмы навучання, забеспячэнне практыкай і стажыроўкамі ў галіне праграмавання — перш за ўсё школьнікаў 13-17 гадоў.

Навучанне праз гульню

Трэба заўважыць, што спрэчкі вакол школьнага курса інфарматыкі не сціхаюць. Хтосьці лічыць, што яе выкладанне трэба распачынаць яшчэ ў пачатковай школе. Што ўменне ўключыць — выключыць камп'ютар, скапіраваць файл, загрузіць і адправіць па інтэрнэце фатаграфію нельга лічыць лічбавай адукаванасцю. Ёсць думка, што ў школе ўвогуле непатрэбны асобны прадмет «Інфарматыка». Напрыклад, у Эстоніі, якая лічыцца адной з самых «прасунутых» у лічбавым плане краін у Еўропе, такога прадмета няма: інфарматыка інтэграваная ва ўсе школьныя дысцыпліны.

— Наш школьны курс разлічаны, хутчэй, на сярэдняга вучня, — разважае Юрый Варатніцкі. — Інфарматыка вывучаецца з шостага да адзінаццатага класа. У праграме два кірункі — інфармацыйныя тэхналогіі і праграмаванне. Але ёсць дзеці, якія хацелі б прасоўвацца ў праграмаванні хутчэй, што яны і робяць. Шчыра кажучы, нам усім сёння праблематычна паспець за нашымі вучнямі з той

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Фота pexels.com

колькасцю крыніц інфармацыі, якія з'яўляюцца, за іх новым успрыманнем інфармацыі. І вось тут паўстае пытанне: а як нам не страціць іх цікавасць да праграмавання? Вядома, ёсць ІТ-курсы па-за школай, якія фарміруюць базавыя веды па праграмаванні, але яны не забяспечваюць дастатковай практыкай для адпрацоўкі профільных навыкаў. А наш праект ліквідуе гэты прабел і дапамагае матываваным школьнікам і студэнтам першых курсаў паглыбіць веды па інфарматыцы і замацаваць іх прымяненне.

«У сферы лічбавізацыі ўсё больш запатрабаванымі будуць творчыя здольнасці і тыя прафесіі, якія штучны інтэлект асіліць не зможа».

У аснове праекта ляжыць ідэя навучання праз гульню. **На спецыяльна створанай платформе WEAZET.COM (https://weazet.com/) карыстальнікі пішуць камп'ютарныя праграмы і спаборнічаюць паміж сабой.** Платформа падхоплівае алгарытмы, якія ў аўтаматычным рэжыме «гуляюць» адзін з адным. Сёння каталог уключае гульні «Марскі бой», «Каровы і быкі», «Крыжыкі-нулікі», але ў далейшым іх спіс будзе пашырацца. Спаборніцтвы — гэта заўсёды захапляльна. Да таго ж мы развіваем у школьнікаў творчыя здольнасці, таму што алгарытмы для спаборніцтваў не маюць адназначна правільнага рашэння. Ты ствараеш свой праграмны прадукт, а хтосьці выстаўляе свой. Праграмы бываюць розныя, але вынік звычайна аднолькавы. А ў нашым выпадку і вынікі — розныя. Хтосьці перамагае. Да таго ж **мы даём будучым абітурыентам магчымасць паглыбіцца ў іх будучую прафесійную дзейнасць, забяспечваем рэальную практыку.**

Алгарытм для перамогі

Стартавым мерапрыемствам праекта стане анлайн-турнір па гульнявым праграмаванні «Місія: Месяц», прысвечаны Дню касманаўтыкі. Канкурсантам прапануецца напісаць алгарытмы кіравання мяккай пасадкай касмічнага карабля на паверхню Месяца і выставіць іх на спаборніцтва. У дапамогу даступныя інструкцыі, якія накіроўваць да міждысцыплінарных ведаў па матэматыцы і фізіцы. Таксама ёсць магчымасць атрымаць кансультацыю ад распрацоўшчыкаў платформы. Праграму можна распрацаваць на адной з трох моў праграмавання: Pascal, C++ ці Python.

«А ведаеце, чаму менавіта факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій задзейнічаны ў праекце? У БДУ ёсць факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі, механіка-матэматычны... Яны быццам бы больш «праграмісцкія», — інтрыгуе Юрый Варатніцкі. — **Проста сёння на першы план выходзяць міждысцыплінарныя веды.** Напрыклад, у задачы, што мы прапанавалі для турніру, прысутнічае не толькі праграмаванне, але і фізіка, асновы касмічнай механікі, матэматыка. На платформе ёсць спасылка да тых ведаў, без якіх праграму скласці будзе немагчыма.

Факультэт радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій працуе менавіта на стыку розных галін ведаў. І ў нас ёсць уласны досвед правядзення, напрыклад, аэракасмічных даследаванняў, таму што менавіта нашы студэнты пад кіраўніцтвам выкладчыкаў стваралі першы ўніверсітэцкі нанаспадарожнік, які знаходзіцца на калязямной арбіце ўжо больш як чатыры гады. Праграмнае забеспячэнне для яго функцыянавання распрацавана нашымі вучонымі. Палётная праграма ствараласся індывідуальна пад тэхнічныя характарыстыкі ракеты-носьбіта, службовай платформы спадарожніка і мэтавай апаратуры.

Ёсць і іншыя міждысцыплінарныя галіны, напрыклад, біяінфарматыка, кіберфізічныя сістэмы, камп'ютарная бяспека, якімі мы займаемся і якія могуць стаць прадметам для стварэння заданняў для спаборніцтваў. Плануем да гадавіны Курскай бітвы запусціць турнір па танкавым баі. Але гэта будзе не звычайная «стралялка», а напісанне алгарытмаў, каб твая баявая машына ў віртуальнай бітве перамагла праціўніка».

Руцінны занятак

— Наш адукацыйны праект называецца «Праграміст — першая прафесія», і я хацеў бы засяродзіць увагу не на слове «праграміст», а на словазлучэнні «першая прафесія», таму што мы, шчыра кажучы, не жадаем бачыць хлопцаў і дзяўчат з універсітэцкай адукацыяй звычайнымі праграмістамі, — падкрэслівае суразмоўнік. — Праграмаванне мы разглядаем менавіта як першы крок у прафесію. Падлеткам трэба атрымаць пэўныя навыкі, якія дапамогуць ім рушыць далей.

Гадоў 30-40 таму самастойную каштоўнасць складалі выпускнікі інстытута замежных моў, таму што веданне замежнай мовы было прафесіяй. А цяпер, калі я хачу нармальна ўзаемадзейнічаць з навуковай супольнасцю, не проста ўмець чытаць, але і друкаваць свае артыкулы ў замежных часопісах, я сам павінен валодаць замежнымі мовамі. Прафесія перакладчыка стала адным з неабходных навыкаў. Тое ж самае адбываецца і з праграмаваннем. Каб быць праграмістам, вышэйшая адукацыя ўжо не патрабуецца. Не выключана, што зусім хутка праграмаванне, тэсціраванне праграмных прадуктаў увогуле перастануць быць чалавечай прафесіяй. Прамысловая рэвалюцыя калісьці вызваліла рабочых ад цяжкай руцінной фізічнай працы, а мы жывём у час лічбавай рэвалюцыі. Праграмаванне — гэта таксама руцінная праца. Таму выпускнікоў свайго факультэта мы бачым сістэмнымі архітэктарамі і бізнес-аналітыкамі, спецыялістамі ў галіне аналізу даных і штучнага інтэлекту, кібербяспекі і кіберфізічных сістэм. У сферы лічбавізацыі ўсё больш запатрабаванымі будуць творчыя здольнасці і тыя прафесіі, якія штучны інтэлект асіліць не зможа.

Цяпер нельга атрымаць адну адукацыю на ўсё жыццё. Трэба пастаянна навучацца і «дабіраць» патрэбныя веды і навыкі, але з чагосьці ж трэба пачынаць. Вось мы і пачынаем з праграмавання. Чаму школьнікі? Напэўна, таму што ў гэтым узросце чалавек найбольш успрымальны да тых ведаў і навыкаў, якія потым стануць падмуркам у яго далейшай прафесійнай дзейнасці. Мы хочам даць магчымасць хлопцам і дзяўчатам, якія цікавяцца інфарматыкай і праграмаваннем, развівацца. І разумеем, што рабіць гэта трэба ва ўзаемадзеянні з настаўнікамі інфарматыкі. *Мяркуем, што праз пэўны час зможам перадаць наш рэсурс педагогам, якія з яго дапамогай і з дапамогай творчых, нетрывіяльных задач арганізуюць дадатковае навучанне школьнікаў.*

Мэта нашага адукацыйнага праекта — зрабіць усё для таго, каб будучыя абітурыенты разумелі, што самае цікавае — не звычайнае праграмаванне, а калі ты займаешся лічбавізацыяй той прадметнай галіны, у якой з'яўляешся прафесіяналам.

Ранняе працаўладкаванне

Цікава, што сам Юрый Варатніцкі пасля заканчэння школы выбіраў паміж фізічным факультэтам і спецыяльнасцю «механіка» на механіка-матэматычным факультэце БДУ. Але сумненні зніклі пасля наведвання факультэта радыёфізікі і электронікі (як ён тады называўся). «На сустрэчы з будучымі абітурыентамі загадчык адной з кафедраў сказаў: «Хлопцы, фізіка — вельмі важная, матэматыка — таксама важная, але калі вы сёння задумаецеся аб сваёй прафесійнай кар'еры, пра тое, кім і дзе вы будзеце працаваць, то факультэт радыёфізікі і электронікі — ваш факультэт, таму што тут вы атрымаеце рэальна запатрабаваную прафесію, — расказвае ён. — Я некалькі разоў змяняў сферу сваёй дзейнасці. Пачынаў працаваць як спецыяліст у галіне тэхнічнай электрадынамікі, абараніў кандыдацкую. У 1990-я гады сферай маёй дзейнасці стала праграмаванне. Шмат гадоў узначальваў у БДУ Цэнтр інфармацыйных тэхналогій. Цяпер яго ўзначальвае мой вучань. А я займаюся канцэптуальным праектаваннем інфармацыйных сістэм, даволі запатрабаваны сістэмны архітэктар і, як кажуць, нядрэнны выкладчык».

«Самае цікавае — не звычайнае праграмаванне, а калі ты займаешся лічбавізацыяй той прадметнай галіны, у якой з'яўляешся прафесіяналам».

Як запэўнівае Юрый Варатніцкі, у выпускнікоў факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій насамрэч няма праблем з працаўладкаваннем, таму што фундаментальная падрыхтоўка на факультэце спалучаецца з прыкладной. «Мы кажам пра сябе, што мы адзіны ў краіне фізіка-тэхнічны факультэт, — усміхаецца ён. — У нас шмат напрамкаў: электроніка, аэракасмічныя даследаванні, тэлекамунікацыі, праграмна-апаратныя сродкі, сістэмы штучнага інтэлекту... Нашы выпускнікі ведаюць і апаратную частку, і «жалеза». І для іх заўсёды знойдзецца прымяненне... Што датычыцца адукацыйнага праекта «Праграмаванне — першая прафесія», то ў гэты стартап не было ўкладзена ні капейкі дзяржаўных сродкаў. Над стварэннем платформы WEAZET.COM працавалі ўсяго 4-5 чалавек. Кіраўнікамі выступаю я і навуковы кансультант ЗАТ «Мапсофт» Міхаіл Зэкаў. У праекта ёсць яшчэ адна мэта — падрыхтоўка шаснаццаці-сямнаццацігадовых хлопцаў і дзяўчат да працаўладкавання ў тыя беларускія ІТ-кампаніі, якія будуць працаваць над задачамі інфарматызацыі і лічбавай трансфармацыі нашай краіны. Не сакрэт, што некаторыя падлеткі пачынаюць падпрацоўваць у сферы ІТ яшчэ са школьных гадоў, працуюць і на першых курсах ВНУ. Таму лепш накіраваць гэты стыхійны працэс у патрэбнае нам рэчышча, каб яны маглі і вучыцца, і працаваць. Трэба забалансаваць гэтыя працэсы. Падлеткі, якія ярка праявяць сябе падчас спаборніцтваў, маюць усе шанцы трапіць у беларускія ІТ-кампаніі. Таму ўсім, каго цікавіць праграмаванне, запрашаем далучацца да нашых турніраў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Рэгістрацыя для ўдзелу ў турніры адкрытая для школьнікаў і студэнтаў на партале WEAZET.COM (https://weazet.com/moon-lander-tournament) да 12 красавіка. Распрацоўваць, тэсціраваць і абнаўляць гульнявы алгарытм без абмежаванняў можна адразу пасля аўтарызацыі да 22 красавіка. Аб'яўленне вынікаў турніру і ўзнагароджанне пераможцаў дыпломамі і каштоўнымі прызамі адбудзецца ў пачатку мая.

ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 143

Сваю новую задачу прапануе наш чытач Міхаіл Кошаль з Мінска *(гл. дыяграму)*.

Белыя: Крf6, Фb1, Лd1, Сb4, Сh5, Кc2, Кg4, пп. a2, b2 (9).

Чорныя: Крd3, Кd2, пп. d4, d5 (4).

Мат за 2 хады.

Прапануем чытачам гэтую задачу для самастойнага рашэння. Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі (вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск, «Звязда») або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

Тры свае паэцыі для пачаткоўцаў даслаў Сяргей Дарошчанка. Ва ўсіх — мат за 2 хады.

№ 1

Белыя: Крa6, Фh7, Лb1, Кf4, Кg5, пп. a7, c5 (7).

Чорныя: Крa8, Фh2, Сa5, Сe8, Кb6, Кe2, пп. d6, d7 (8).

№ 2

Белыя: Крg1, Фf6, Лe2, Лg2, пh5 (5).

Чорныя: Крg8, Фd8, Лe8, Кg6, пп. c7, d7, f7, h7 (8).

№ 3

Белыя: Крf8, Лa7, Cb1, Ch2, пd7 (5).

Чорныя: Крh8, Cb7, Кc6, Кh6, пh7 (5).

* * *

У Мінску прайшлі першынствы Беларусі сярод юнакоў і дзяўчат да 12, 14 і 16 гадоў. Іх пераможцамі і прызёрамі сталі:

юнакі да 12 гадоў — 1) Радзівон Сідарэня (Баранавічы), 2) Міхаіл Дзеніseня (Мінск), 3) Дзмітрый Макарэвіч (Брэст);

юнакі да 14 гадоў — 1) Дзяніс Бруцкі (Брэст), 2) Арцём Бяляўскі (Мінск), 3) Сяргей Барысчык (Мінск);

юнакі да 16 гадоў — 1) Арцём Сіняўскі (Мінск), 2) Арцём Стрыбук (Мінск), 3) Ягор Сіліч (Віцебск);

дзяўчаты да 12 гадоў — 1) Вераніка Абрамкіна (Магілёў), 2) Дар'я Сакун (Гомель), 3) Аляксандра Каспяровіч (Мінск);

дзяўчаты да 14 гадоў — 1) Юлія Лявонава (Гомель), 2) Маргарыта Бендзік (Магілёў), 3) Марына Хоміч (Мінск);

дзяўчаты да 16 гадоў — 1) Аляксандра Шабан (Кобрын), 2) Ксенія Норман (Гродна), 3) Рэната Аюшава (Мінск).

* * *

Прапануем прааналізаваць яшчэ дзве партыі з мінулага чэмпіянату Беларусі ў першай лізе.

Максім Царук — Ігар Люцко. 1. e4 c5 2. Kf3 d6 3. d4 cd 4. K:d4 Kf6 5. Kc3 Kc6 6. Cg5 e6 7. Фd2 a6 8. 0-0-0 Bd7 9. f4 h6 10. Ch4 g5 11. fg Kg4 12. Ce2 Kge5 13. Kf3 Ce7 14. Cf2 hg 15. Ka4 K:f3 16. gf Фa5 17. Ф:a5 K:a5 18. Kb6 Лd8 19. Лd2 Kc6 20. Kc4 Cc8 21. Cg3 e5 22. c3 f5 23. ef C:f5 24. Лhd1 Лh6 25. Ke3 Ce6 26. Крb1 Лd7 27. Cd3 Cd8 28. Kg4 Лh8 29. Ce4 Крe7 30. Cf2 Лg8 31. Ce3 Лg7 32. Kh6 Cc7 33. Лg2 KpPf8 34. C:g5 Cd8 35. h4 C:g5 36. hg5 d5 37. Cc2 d4 38. f4 ef 39. Лf1 d3 40. Л:f4+, 1:0.

Сяргей Сарычаў — Арцём Стрыбук. 1. d4 Kf6 2. c4 g6 3. g3 c5 4. d5 b5 5. cb a6 6. ba Cg7 7. Kc3 d6 8. Kf3 0-0 9. Cg2 Cf5 10. Kh4 Cd7 11. 0-0 K:a6 12. e4 Фb6 13. Лb1 Kc7 14. h3 Kb5 15. Ce3 Лfb8 16. Фc2 Ke8 17. Лfd1 Kec7 18. K:b5 K:b5 19. a4 Kd4 20. C:d4 C:a4 21. b3 C:b3 22. Л:b3 Ф:b3 23. Ф:b3 Л:b3 24. C:g7 Кр:g7 25. Лd2 Лa1+ 26. Крh2 Лab1 27. g4 Л1b2 28. Л:b2 Л:b2 29. Крg3 c4 30. Крf3 c3 31. Крe3 Л:f2, 0:1.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Фc6! Першыя правільна адказалі Васіль Жуковіч, Фёдар Карпей, Ігар Ананіч, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Сяргей Цяльпук.

Вадзім ЖЫЛКО.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29**
Оператор ЭТП	**ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by**

Предмет электронных торгов. Лоты №№ 1–2 – машино-места

Лот №	Инвентар. номер	Общая площадь	Адрес	Начальная цена лота с НДС 20 %, бел. руб.
1	500/D-708120455	32,1 кв. м	**г. Минск, ул. Авакяна, 19-348 Обременение: аренда**	**39 916,78**
2	500/D-708120446	30,1 кв. м	**г. Минск, ул. Авакяна, 19-332**	**40 360,44**

Лот № 3 – доля в праве на изолированное помещение
Местоположение: **г. Брест, ул. Ясеневая, 6**

1/2 доля в праве на изолированное помещение № 1 (торговое помещение), инвентарный номер 100/D-81249, общая площадь помещения 283,3 кв. м	**107 520,00**

Сведения о земельном участке 140100000001007697: предоставлен на праве долевой аренды (1/6 доля) по 18.11.2053 для строительства и обслуживания мини-пекарни с магазином

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **10** рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

8.05 Зразумелая палітыка.
9.10, 21.45 Серыял «След» (16+).
10.45, 0.05 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Дыпламат» (16+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.45, 15.25 Драма «Ніцая вярба» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларускі час.
21.00 Панарама.
23.15 Сфера інтарэсаў.
23.50 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.30 Тэлебарометр.
9.05, 20.10 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00, 17.40 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
10.50, 22.05 Серыял «Такая работа» (16+).
12.15 «Сямейныя гісторыі». (16+).
12.45, 21.15 Серыял «Доктар Надзея» (16+).
13.35, 18.35 «Веру не веру» (16+).
14.25 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
14.50 «Вось такія людзі» (12+).
15.05 Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Да пабачэння» (16+).
19.20 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
23.35 «Багіня шопінгу. Бітва бландзінак» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.10 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 16.30, 20.30, 23.50 Навіны культуры.
8.15, 18.20 «Акцёрскія драмы. Апошнія ролі». Дак. фільм (12+) [СЦ].
8.55, 19.00 «Салдат Іван Броўкін». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.25 «Люблю і памятаю».
11.00, 17.20 «Дом з лілеямі». Серыял (16+) [СЦ].
12.40 «Наперад у мінулае».
13.05, 21.05 «ТАСС упаўнаважаны заявіць...» Серыял (12+) [СЦ].
15.25 «Кадры жыцця».
16.15 «Архітэктура Беларусі» [СЦ].
16.40 «Сваімі словамі».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.20 «Камертон».

Беларусь 5

7.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Баварыя» (Германія) — «Вільярэал» (Іспанія).
8.55 Насустрач мары. ЧС па футболе — 2022. Хранікальна-дакументальны фільм.
9.55 Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. ЦСКА (Масква) — СКА (Санкт-Пецярбург).
11.50 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Рэал» (Мадрыд, Іспанія) — «Чэлсі» (Англія).
13.50 Спорт-кадр.
14.25 Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету.
16.00 Між іншым.
16.20 Слэм-данк.
16.50 Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. «Трактар» (Чэлябінск) — «Металург» (Магнітагорск) / Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. «Будаўнік» (Мінск) — «Шахцёр» (Салігорск).
19.20 Хакей. Чэмпіянат Беларусі.
21.50 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Атлетыка» (Іспанія) — «Манчэстэр Сіці» (Англія).
23.55 Баскетбол. Адзіная ліга ЗГБ. «Зеніт» (Санкт-Пецярбург) — «Цмокі-Мінск».

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
10.00 «Правілы жыцця беларускіх спартсменаў» (12+).
10.15 «Жыць здорава!» (16+)
11.15, 22.15 Серыял «Сінія ночы» (16+).
13.15, 16.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
18.55 «Удача ў прыдачу!» (12+)
19.00 «Аб'ектыўНа» (16+).
20.00 Вячэрнія навіны.
21.15 Серыял «Ніхто не даведаецца» (16+).
0.00 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.10 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.15, 20.55, 1.00 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 21.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
16.00, 16.50 «Энігма». Серыял (16+).
20.25, 23.05 «СТБ-спорт».
20.30 «Сталічныя падрабязнасці».
20.40 «Міншчына».
23.10 «Правілы жыцця беларускіх спартсменаў».

МІР

5.00 Маст. фільм «Светлы шлях» (0+).
5.45, 10.10 Серыял «Суччына вайна» (12+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.15, 17.50, 3.40 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.05, 16.15, 4.25 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.10 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.05 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25, 20.05 «Гульня ў кіно» (12+).
20.45, 21.35 «Слабае звяно» (12+).
22.30 «Назад у будучыню» (16+).
23.15 Серыял «Свае» (16+).
0.40 Дак. серыял «Адкрыты космас» (0+).
2.25 «Гістарычны дэтэктыў з Мікалаем Валуевым» (12+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
17.30 Серыял «Земскі доктар» (12+).
20.35 «Р.S.»
21.05, 0.40 Серыял.
22.10, 23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

6.00 «Астрапрагноз».
6.05, 7.25, 8.25, 16.45, 19.55, 21.55, 23.15 Сёння. Галоўнае.
6.10, 23.30 Серыял «Снайпер. Зброя адплаты» (12+).
6.55 «Маршрут пабудаваны» (12+).
7.40 Сфера інтарэсаў.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 22.00 «НЗ.by».
8.55 Пракурорская праверка (16+).
10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).
12.10 Баявік «Марскія д'яблы. Паўночныя рубяжы» (16+).
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
13.55, 16.50 Дэтэктыў «Аддзел» (16+).
17.10 «За гранню» (16+).
18.05 «ДНК» (16+).
20.10 Серыял «Чынгачгук» (16+).
22.20 Баявік «Марскія д'яблы. Далёкія рубяжы» (16+).

8 канал

7.00, 15.15, 17.10, 21.05, 1.15 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Рапунцэль».
7.50 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.55 Серыял «Дзяцінства Шэлдана» (6+).
8.15 Серыял «Закінутыя ў космасе» (12+).
9.05 Серыял «Заблытаныя лёсы» (12+).
10.35 Серыял «Эквадор».
11.20 Серыял «Чукур» (16+).
12.50 Баявік «Місія невыканальная» (16+).
15.20 «Хачу ў кіно» (12+).
15.30 Мультпарад. «Дом Савы» (0+).
16.15 Серыял «Абацтва Даўнтан» (18+).
17.15 «Любімае кіно».
20.00 Серыял «Эмігрант» (18+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.10 «Фэшн is my прафэшн» (12+).
21.20 Драма «Апошняя дуэль» (18+).
23.50 Скандынаўскі дэтэктыў «Вістынг» (16+).

ВТВ

6.00 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
12.00 «Велабайкі» (16+).
12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
13.25 «Галілеа» (12+).
13.50 Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
14.45 «Уральскія пельмені» (16 +).
16.05 Серыял «Міша псуе ўсё» (16+).
17.00, 1.30 Серыял «90-я. Весела і гучна» (16+).
19.10 «Суперліга» (16+).
20.30 Серыял «Пастукай у мае дзверы» (16+).
23.40 Трылер «148» (16+).
3.35 Серыял «Кадэцтва» (12+).
5.10 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.45 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Рускі стыль.
7.35 «Ісус Хрыстос. Жыццё і вучэнне» [СЦ].
8.25 Легенды сусветнага кіно.
8.50, 16.15 «Лівень». Маст. фільм [СЦ].
10.20 XX стагоддзе.
12.10 Колер часу.
12.30 «Продкі нашых продкаў».
13.15 «Першыя ў свеце».
13.30 Улада факта.
14.15 Астравы [СЦ].
15.05 Лісты з правінцыі [СЦ].
15.30 «Энігма. Герберт Блумстэт».
17.25 «Забытае рамяство».
17.40, 1.50 Міхаіл Плятнёў. Канцэрт у Вялікай зале Маскоўскай кансерваторыі.
18.45 «Царская ложа».
19.45 Шукальнікі [СЦ].
20.30 Лінія жыцця [СЦ].
21.25 «Небяспечныя гастролі». Маст. фільм [СЦ].
22.50 «2 Вернік 2».
0.05 «Я ніколі не плачу». Маст. фільм.

Настальгія

6.00 «Спяем, сябры!» (12+)
7.00 Маст. фільм «Сустрэнемся на Таіці» (18+).
8.20, 9.40, 11.00, 12.50, 14.45, 15.40, 17.00, 18.40, 20.40, 21.40, 23.40, 1.05, 2.35, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
8.45 «Сядзі і глядзі» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Эліта Краіны Саветаў» (16+).
13.20 Маст. фільм «Нага» (18+).
17.20, 23.00 «Блеф-клуб» (18+).
18.00 «Да і пасля...» (16+)
19.00 Маст. фільм «Башмачнік» (18+).

22.00 «Колба часу» (16+).
0.00 «Быў час» (16+).
1.20 Маст. фільм «Год цяляці» (18+).

EuroSport 1

0.00 Тэлечасопіс Judo Show (16+).
1.00, 4.00, 8.00, 11.00 Снукер. Turkish Masters (6+).
2.30, 6.00, 9.30, 12.00, 13.00, 16.30, 22.00 Веласпорт. Тур Турцыі (16+).
3.15, 10.15, 14.50, 17.30, 23.30 Веласпорт. Тур Сіцыліі (16+).
18.30, 20.30 Навіны (16+).
18.35 Снукер. Чэмпіянат свету (6+).
20.35 Трыятлон. SLT Arena Games (6+).

Кінакамедыя

1.00 Ружовая Пантэра (12+).
2.35 Ружовая Пантэра-2 (12+).
4.00 Нязносныя босы-2 (16+).
5.50 Дзікая парачка (16+).

7.40 Шосты гулец (12+).
9.40 Прыкінься маёй жонкай (12+).
11.50 Сястрычка, дзейнічай-2 (12+).
13.50 Красуні ва ўцёках (16+).
15.25 Чаму ён? (16+)
17.30 Першая дачка (12+).

19.30 Норт (12+).
21.05 Кадры (12+).
23.20 Ноч у Роксберы (18+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.40 «Громавы» (16+).
10.30, 4.00 «Паглядзім» (12+).
11.00 «Поўня». Серыял (16+).
12.05, 1.30 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.00 «Любоўная магія» (16+).
13.30, 18.05, 2.20 «Сляпая» (16+).
14.25, 19.00, 3.10 «Варажбітка» (16+).
15.20 «Гэтая рэальная гісторыя» (16+).
16.15, 0.45 «Гарадскія легенды» (16+).
17.10 «Ведзьмакі свету» (16+).
19.55 «Да сустрэчы з табой» (16+).
21.50 «Пёрл Харбар» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

TV 1000 ТБ1000

5.30, 6.10, 17.20, 18.10 Доктар Хаус (16+).
7.00 Двое: я і мой цень (16+).
8.45 Эмоджы фільм (6+).
10.15 Дрэнныя дзяўчаты (12+).
12.00 10 прычын маёй нянавісці (16+).
13.45 Выдатніца лёгкіх паводзін (16+).

15.20 Неверагодны Халк (16+).
19.00 Эван Усёмагутны (12+).
20.40 Захавальнік часу (12+).
22.55 Лемані Снікет: 33 няшчасці (12+).
0.40 У пагоні за шчасцем (12+).
2.30 Абаронца (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.05, 15.15 Спадарожнік (16+).
8.20 Пабочны эфект (16+).
9.55 Зацьменне (12+).
11.20 Унук касманаўта (12+).
12.45 Час першых (6+).

17.10, 17.35, 18.05, 18.30 Апошні з Магікян (12+).
19.00 Параграф 78: фільм першы (16+).
20.30 Параграф 78: фільм другі (16+).
22.10 Кольская звышглыбокая (16+).
0.05 Гагарын. Першы ў космасе (6+).
1.55 Галоўны (6+).
3.40 Каралёў (12+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.25, 7.15 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.05, 9.00 Інстынкт выжывання (16+).
9.50, 10.45 Аўта-SOS (16+).
11.35, 12.25 Дзікі тунец (16+).
13.15, 14.05, 19.15, 20.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).
14.55, 15.55, 2.00, 2.50 Марс (16+).
16.45 Злавіць кантрабандыста (16+).
17.40 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.30, 18.55 Фабрыка ежы ў Амерыцы (16+).
21.00, 21.50, 3.35 Егіпет з вышыні птушынага палёту (16+).
22.45, 23.35 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
0.30, 1.15 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
4.20 Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).
5.05, 5.35 Гульні розуму (16+).

Discovery

8.00, 7.35 Як гэта ўладкавана? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Багажныя войны (12+).
10.15, 10.40, 21.15, 21.40 Як гэта зроблена? (16+)
12.05 Залатая ліхаманка (16+).
13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10 Бітвы за кантэйнеры (12+).
17.35 Вулічныя гонкі (16+).
18.30 Іржавая імперыя (12+).
19.25, 4.27 Вялікія брудныя гонкі (12+).
23.05, 5.14 Загадка ранча Блайнд-Фрог (16+).
0.00, 6.01 Дарожныя каўбоі (18+).
0.55, 6.48 Бітва пітмайстраў (16+).
1.50, 2.45, 3.40 Смяротны ўлоў (18+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

Беларусь 1

6.00, 7.30, 8.30 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.20, 8.20 Навіны эканомікі.
7.25, 8.25, 18.15 Зона Х (16+).
9.10 Серыял «След» (16+).
10.45, 0.45 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.45, 19.20 Драма «Дыпламат» (16+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.45, 15.25 Драма «Ніцая вярба» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Дача (12+).
17.30 Існасць [СЦ].
21.00 Панарама.
21.45 Клуб рэдактараў (16+).
22.50 Серыял «Сельскі дэтэктыў» (12+).
0.30 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.20 Тэлебарометр.
9.05 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00, 17.35 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
10.50 Серыял «Такая работа» (16+).
12.20 «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
12.45 Серыял «Доктар Надзея» (16+).
13.35 «Веру не веру» (16+).
14.25 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
14.50 «Вось такія людзі» (12+).
15.05 Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Да пабачэння» (16+).
18.25 «На нажах» (16+).
19.20 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).
20.10, 21.15 «Тата папаў» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
22.30 «Амаль былыя» (16+).
0.15 «Багіня шопінгу. Бітва бландзінак» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 15.40, 1.05 Навіны культуры.
8.15, 16.50 «Нона Мардзюкова. Права на адзіноту». Дак. фільм (12+) [СЦ].
8.55, 17.30 «Простая гісторыя». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.20 «Люблю і памятаю».
11.00, 15.50 «Дом з лілеямі». Серыял (16+) [СЦ].
12.10 «Сіла веры».
12.35 «Наперад у мінулае».
13.05, 21.05 «ТАСС упаўнаважаны заявіць...» Серыял (12+) [СЦ].
15.15 «Кампазітары Беларусі».
19.00 Вялікая пятніца.
20.40 «Калыханка» (0+).
23.20 Трансляцыя Хрэснага Ходу з Рымскага Калізея з удзелам Папы Рымскага Францыска.

Беларусь 5

7.00 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА.
8.55 Фактар сілы.
9.30 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Барселона» (Іспанія) — «Айнтрахт» (Германія).
11.30 Між іншым.
11.50 Футбол. Ліга Еўропы. Ліга канферэнцый. Анлайн гульнявога дня.
13.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
14.50 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. «Віктарыя» (Смалявічы) — ХК «Мінск».
16.20 Авертайм.
16.50 Хакей. КХЛ. Усходняя канферэнцыя. «Металлург» (Магнітагорск) — «Трактар» (Чэлябінск).
19.20 Хакей. Чэмпіянат Беларусі.
21.40 Планета спорту.
22.00 Свет англійскай прэм'ер-лігі. Відэачасопіс.
22.30 Хакей на траве. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны. «Віктарыя» (Смалявічы) — ХК «Мінск».
23.55 На шляху да ЧС-2022. Відэачасопіс.

АНТ

6.00, 7.10, 8.10, 9.10 «Наша раніца».
6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
10.00 «Правілы жыцця беларускіх спартсменаў» (12+).
10.15 «Жыць здорава!» (16+)
11.15, 0.05 Серыял «Сінія ночы» (16+).
13.15, 16.45, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
16.20 «Трывожная кнопка» (16+).
18.45 «Удача ў прыдачу!» (12+)
18.50 «Поле цудаў» (16+).
20.00 Вячэрнія навіны.
21.15 Канцэрт Ірыны Дарафеевай «Усё пачынаецца з любові» (12+).
23.00 «Што? Дзе? Калі?» (16+)

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.05 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.20, 20.40, 0.55 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.35, 21.35 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
15.50, 16.50 «Пасажыр без багажу». Серыял (16+).
20.10, 23.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Сталічныя падрабязнасці».
20.25 «Міншчына».
23.10 «Правілы жыцця беларускіх спартсменаў».

МІР

5.00 Маст. фільм «Аршын мал алан» (0+).
6.10, 3.55 Мультфільмы (0+).
7.15 Маст. фільм «Чыстае неба» (12+).
9.05, 10.20 Серыял «Свае» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
10.10 «У гасцях у лічбы» (12+).
13.15 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.05, 16.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.10 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.25 Маст. фільм «Формула кахання» (12+).
19.15 «Слабае звяно» (12+).
20.10 «Гульня ў кіно» (12+).
20.45 «Сусветныя гульні розуму» (16+).
21.20 Маст. фільм «Жорсткі раманс» (12+).
23.55 Маст. фільм «Жаніцьба Бальзамінава» (6+).
1.20 Маст. фільм «Вясна» (6+).
3.05, 3.30 «Набытак рэспублік» (12+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
17.30 Фільм «Салодкая жанчына» (12+).
21.05 Фільм «Сардэчных спраў майстар» (12+).
23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.25, 8.25, 16.45, 19.55, 22.30, 23.40 Сёння. Галоўнае.
6.05 Серыял «Снайпер. Зброя адплаты» (12+).
7.00 «Маршрут пабудаваны» (12+).
7.40 Сфера інтарэсаў.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 21.00 «НЗ.by».
8.55 Пракурорская праверка (16+).
10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Паўночныя рубяжы» (16+).
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
13.55, 16.45 Дэтэктыў «Аддзел» (16+).
18.05 «Чакай мяне» (12+).
20.10 «Следства вялі...» (16+)
21.30, 22.35 «Краіна талентаў» (12+).
23.55 «Па следзе монстра» (16+).

8 канал

7.00, 15.25, 19.20, 21.10, 0.45 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Рапунцэль» (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Дзяцінства Шэлдана» (6+).
8.15 Серыял «Закінутыя ў космасе» (12+).
9.35 Серыял «Эквадор».
10.20 Драма «Хітрасці лёсу» (16+).
12.00 Серыял «Чукур» (16+).
13.30 Дэтэктыў «Кома» (12+).
15.30 «Хачу ў кіно» (12+).
15.40 Мультпарад. «Дом Савы» (0+).
16.25 Серыял «Абацтва Даўнтан» (18+).
17.30 Трылер «Недаравана» (18+).
19.25 Серыял «Па слядах Агаты Крысці» (12+).
20.55 «Вечарніца» (0+).
21.15 Прыгодніцкі фільм «Смерць на Ніле» (16+).
23.15 Скандынаўскі дэтэктыў. «Вістынг» (16+).

ВТВ

6.00 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45, 23.00 «КВЗ. Панашаму» (16+).
12.00 «Наш рамонт» (16+).
12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
13.25 «Галілеа» (12+).
13.50 Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
14.45, 18.40 Серыял «Госці з мінулага» (16+).
16.05 Серыял «Міша псуе ўсё» (16+).
17.00, 0.55 Серыял «90-я. Весела і гучна» (16+).
20.00 Серыял «Пастукай у мае дзверы» (16+).
21.00 Фантастыка «Знак» (12+).

0.00 Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
2.35 Серыял «Кадэцтва» (12+).
4.10 «Адна за ўсіх» (16+).
5.10 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Рускі стыль.
7.35, 18.40 «Ісус Хрыстос. Жыццё і вучэнне» [СЦ].
8.25 Легенды сусветнага кіно.
8.50, 16.35 «І гэта ўсё пра яго». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 23.50 XX стагоддзе.
12.10, 18.25 «Забытае рамяство».
12.30 «Продкі нашых продкаў».
13.15 «Першыя ў свеце».
13.30 Штучны адбор.
14.15 Астравы [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Кіно.
15.20 «Біблейскі сюжэт».
15.50 «Белая студыя».
17.45, 0.50 Міхаіл Плятнёў. Канцэрт у Вялікай зале Маскоўскай кансерваторыі.
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Почырк эпохі» [СЦ].
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 «Абсалютны слых».
21.30 Улада факта.
22.15 «Варта». Серыял.
23.00 «Даваеная асоба гісторыі». Серыял [СЦ].
1.30 Больш, чым каханне [СЦ].
2.10 «Верэя. Вяртанне да сябе». Дак. фільм.

Настальгія

6.00 «СевАлогія» (18+).
7.00, 8.45, 9.40, 11.00, 13.05, 14.35, 15.40, 17.00, 20.20, 21.40, 23.00, 1.00, 2.45, 3.40 Музычная настальгія (12+).
7.15 Маст. фільм «Іспанская актрыса для рускага міністра» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 0.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Быў час» (16+).
13.20 Маст. фільм «Год цяляці» (18+).
18.00 «Спяем, сябры!» (12+)
19.00 Маст. фільм «Сустрэнемся на Таіці» (18+).
20.45 «Сядзі і глядзі» (18+).
1.35 Музычны спектакль «Рака» (18+).
3.50 Маст. фільм «Жыццё забаў поўнае» (18+).
5.25 «Блеф-клуб» (16+).

EuroSport 1

0.00, 7.00 Кёрлінг. ЧС. Мужчыны (6+).
2.30, 6.00, 9.30, 12.00, 13.00, 23.00 Веласпорт. Тур Турцыі (16+).
3.15, 14.50, 23.45 Веласпорт. Тур Сіцыліі (16+).
4.00 Снукер. European Masters (6+).
10.30 Тэлечасопіс Cycling Show (16+).
11.00 Скалалажанне. Кубак свету (6+).
16.30, 22.00 Веласпорт. «Флэш Брабансан» (16+).
18.45 Гольф. «Мастэрс» (6+).
19.45, 21.25 Навіны (16+).
19.50 Снукер. Welsh Open (6+).
21.30 Тэлечасопіс Cycling Show (16+).

Кінакамедыя

1.25 Каханне прэт-а-партэ (12+).
2.50 Дзікая парачка (16+).
4.35 Больш за секс (16+).
6.30 Руковая Пантэра-2 (12+).
8.10 Бландзінка ў законе (12+).
10.00 Лёгкія паводзіны (16+).
11.50 Шосты гулец (12+).
13.45 Сястрычка, дзейнічай-2 (12+).
15.45 Прыкінься маёй жонкай (12+).
17.55 Ноч у Роксберы (18+).
19.30 Занадта крута для цябе (16+).
21.25 Нязносныя босы-2 (16+).
23.25 Пакуль вяселле не разлучыць нас (12+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
10.00 «Громавы» (16+).
10.50, 4.15 «Перыскоп» (16+).
11.10 «Поўня». Серыял (16+).
12.15 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.05, 17.25 «Любоўная магія» (16+).
13.35, 18.00 «Старац» (16+).
14.35, 19.35, 2.25 «Сляпая» (16+).

15.30, 20.35, 3.20 «Варажбітка» (16+).
16.25 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
17.25 «Любоўная магія» (16+).
21.35 «Сельскі дэтэктыў» (16+).
22.30 «З чаго пачынаецца Радзіма» (16+).
23.30 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
0.25 «Лінія абароны» (16+).
0.55 «Хаціка» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.50, 6.30, 17.20, 18.10 Доктар Хаус (16+).
7.20, 2.55 Кухар на колах (12+).
9.25 Трансформеры (12+).
11.55 Трансформеры-3: цёмны бок Месяца (16+).
14.40 Трансформеры: помста паўшых (16+).
19.00 Лары Краўн (16+).
20.45 Форэст Гамп (12+).

23.15 Капітан Філіпс (16+).
1.35 Шэф (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

6.05 Зорны розум (16+).
8.05 Гагарын. Першы ў космасе (6+).
10.05 Галоўны (6+).
12.00 Каралёў (12+).
14/05. 4.50 Вайна полаў (16+).
15.40, 3.30 Востраў шанцавання (12+).
17.10, 17.35, 18.05, 18.30 Апошні з Магікян (12+).
19.00 Прыцягненне (12+).
21.00 Зорны розум (16+).
22.50 Унук касманаўта (12+).
0.10 Кольская звышглыбокая (16+).
2.05 Цяжкасці выжывання (16 +).

National Geographic

6.00, 5.35 Навуковыя глупствы (16+).
6.25, 7.15 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.05, 9.00 Інстынкт выжывання (16+).
9.50, 10.45, 16.45 АўтаSOS (16+).
11.35, 12.25, 21.00, 21.50, 3.30 Дзікі тунец (16+).
13.15, 14.05, 19.20 Расследаванні авіякатастроф (16+).
14.55, 15.50, 1.50, 2.40 Марс (16+).
17.40 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.30, 5.00, 5.25 Гульні розуму (16+).
20.10 Аляска: новае пакаленне (16+).
22.40, 23.30 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
0.20, 1.05 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
4.10 Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).

Discovery

8.00, 1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04, 7.35 Як гэта ўладкавана? (12+)
8.25, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Багажныя войны (12+).
10.15, 10.40, 21.15, 21.40 Як гэта зроблена? (16+)
11.10 Хуткія і гучныя (12+).
12.05 Як уладкаваныУсвет (16+).
13.00 Давід Андрэс каляскіць па свеце (12+).
13.55, 14.50, 15.45 Грандыёзныя машыны Аляскі (12+).
17.35 Вулічныя гонкі (16+).
18.30 Іржавая імперыя (12+).
19.25, 4.27 Вялікія брудныя гонкі (12+).
23.05, 5.14 Пчаліны кароль (12+).
0.00, 6.01 Голыя і напалоханыя (18+).
0.55, 6.48 У дзікіх умовах (16+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

чацвер, 14 красавіка ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Беларусь 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 18.15, 0.00 Зона Х (16+).
9.10, 22.15 Серыял «След» (16+).
10.45, 0.35 «Скажынемаўчы».
11.45, 12.10, 13.05, 18.35, 19.20 Драма «Дыпламат» (16+).
14.00 «Здорава здаровым быць!» (6+) [СЦ]
14.45, 15.25 Драма «Ніцая вярба» (16+).
15.10, 18.00 Навіны рэгіёна.
17.05 Беларускі час.
21.00 Панарама.
21.45 Адзін дзень (12+).
23.45 Сфера інтарэсаў.
0.20 Дзень спорту.

Беларусь 2

6.00 «Уключайся!» (12+)
9.00, 18.25 Тэлебарометр.
9.05, 20.10 Серыял «Сляпая» (16+).
10.00, 17.35 «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
10.50, 22.05 Серыял «Такая работа» (16+).
12.20 «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].
12.50, 21.15 Серыял «Доктар Надзея» (16+).
13.35, 18.30 «Веру не веру» (16+).
14.20 «Камень, нажніцы, папера» (16+).
14.50 «Вось такія людзі» (12+).
15.05 Анімацыйны серыял «Качыныя гісторыі» (0+).
15.55 Нічога сабе ньюз (12+).
16.00 «ПІН_КОД» (12+).
16.55 «Да пабачэння» (16+).
19.20 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
23.35 «Багіня шопінгу. Бітва бландзінак» (16+).

Беларусь 3

7.00 «Дабраранак».
7.35, 12.10 «Беларуская кухня».
8.05, 12.00, 16.30, 20.30, 0.00 Навіны культуры.
8.15, 18.15 «Акцёркія лёсы. Прыгажосць ні пры чым». Дак. фільм (12+) [СЦ].
8.50, 18.55 «Іван Броўкін на цаліне». Маст. фільм (12+) [СЦ].
10.25 «Люблю і памятаю».
11.00, 17.15 «Дом з лілеямі». Серыял (16+) [СЦ].
12.40 «Наперад у мінулае».
13.05, 21.05 «ТАСС упаўнаважаны заявіць...» Серыял (12+) [СЦ].
15.35 «Кадры жыцця».
16.40 «Сваімі словамі».
20.40 «Калыханка» (0+).
23.35 «Камертон».

Беларусь 5

7.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Ліверпуль» (Англія) — «Бенфіка» (Партугалія).
8.55 Слэм-данк.
9.25 Баскетбол. Чэмпіянат Беларусі. Жанчыны.
11.10 Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. «Будаўнік» (Мінск) — «Шахцёр» (Салігорск).
13.05 Хакей. Чэмпіянат Беларусі.
15.00 Баскетбол. Адзіная ліга ЗГБ. «Зеніт» (Санкт-Пецярбург) — «Цмокі-Мінск».
16.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. «Атлетыка» (Іспанія) — «Манчэстэр Сіці» (Англія).
18.45 Фактар сілы.
19.20 Хакей. КХЛ. Заходняя канферэнцыя. СКА (Санкт-Пецярбург) — ЦСКА (Масква) / Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Аталанта» (Італія) — «Лейпцыг» (Германія).
21.50 Футбол. Ліга Еўропы. Ліга канферэнцый. Анлайн гульнявога дня.

АНТ

6.00, 7.15, 8.15 «Наша раніца».
6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
7.10, 8.10 «Трывожная кнопка» (16+).
9.10 «Аб'ектыўНа» (16+).
10.15 «Жыць здорава!» (16+)
11.15, 22.55 Серыял «Сінія ночы» (16+).
13.15, 16.20, 18.20 Інфармацыйны канал (16+).
21.15 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
21.55 Серыял «Ніхто не даведаецца» (16+).
0.45 Час.

СТБ

6.00, 6.40, 7.45, 8.40 «Раніца СТБ».
6.30 [СЦ], **7.30** [СЦ], **8.30** [СЦ], **10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
9.00, 0.05 «Загадкі чалавецтва з Алегам Шышкіным» (16+).
10.40 «Як уладкаваны свет» (16+).
12.15, 20.50, 0.50 «Самыя шакавальныя гіпотэзы» (16+).
13.45, 23.20 «Таямніцы Чапман» (16+).
14.40, 21.40 «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
16.00, 16.50 «Энігма». Серыял (16+).
20.20, 23.05 «СТБ-спорт».
20.25 «Сталічныя падрабязнасці».
20.35 «Міншчына».
23.10 «Правілы жыцця беларускіх спартсменаў».

МІР

5.00 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (12+).
5.25 Маст. фільм «Васіліса Прыгожая» (0+).
6.40 Мультфільмы (0+).
7.45 Маст. фільм «Формула кахання» (12+).

9.15, 10.10, 23.15 Серыял «Свае» (16+).
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Навіны (бягучы радок).
13.15, 17.50, 2.30 «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
14.05, 16.15, 3.15 «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
15.10, 3.55 «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
17.05 «Міравое пагадненне» (16+).
19.25, 20.05 «Гульня ў кіно» (12+).
20.45, 21.35 «Слабае звяно» (12+).
22.30 «Назад у будучыню» (16+).
1.20 «Гістарычны дэтэктыў з Мікалаем Валуевым» (12+).
4.40 Маст. фільм «Аршын мал алан» (0+).

РТР—Беларусь

6.05 «Новая раніца».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Аб самым галоўным» (12+).
12.35 «Кропкі над і» (16+).
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 «60 хвілін» (12+).
17.30 Серыял «Земскі доктар» (12+).
21.05, 0.40 Серыял.
22.10, 23.10 «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

НТБ—Беларусь

5.55 «Астрапрагноз».
6.00, 7.25, 8.25, 16.45, 19.55, 21.55, 23.15 Сёння. Галоўнае.
6.05, 23.30 Серыял «Снайпер. Зброя адплаты» (12+).
7.00 «Маршрут пабудаваны» (12+).
7.40 Сфера інтарэсаў.
8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.35, 22.00 «НЗ.by».
8.55 Пракурорская праверка (16+).
10.35 Баявік «Марскія д'яблы. Паўночныя рубяжы» (16+).
13.25 Надзвычайнае здарэнне.
13.55, 16.50 Дэтэктыў «Аддзел» (16+).
17.10 «За гранню» (16+).
18.05 «ДНК» (16+).
20.10 Серыял «Чынгачгук» (16+).
22.20 Баявік «Марскія д'яблы. Далёкія рубяжы» (16+).

8 канал

7.00, 15.55, 19.45, 21.10, 0.05 «Надвор'е» + «Эрана».
7.05 Мультпарад. «Рапунцэль» (0+).
7.30 «Прыколы 13-й школы» (6+).
7.35 Серыял «Дзяцінства Шэлдана» (6+).
8.15 Серыял «Закінутыя ў космасе» (12+).
9.35 Серыял «Эквадор».
10.20 Драма «Хітрасці лёсу» (16+).
12.00 Серыял «Чукур» (16+).
13.30 Драма «Фаварыт» (12+).
15.55 «Хачу ў кіно» (12+).
16.00 Мультпарад. «Дом Савы» (0+).
16.45 Серыял «Абацтва Даўнтан» (18+).
17.55 «Гатуй як шэф» (12+).
18.05 «Смачнае кіно». «Душэўная кухня» (12+).
19.55 Серыял «Па слядах Агаты Крысці» (12+).
20.50 «Вечарніца» (0+).
21.00 «Салам алейкум, Беларусь!»
21.15 Трылер «Асноўны інстынкт» (18+).
23.20 Скандынаўскі дэтэктыў «Вістынг» (16+).

ВТВ

6.00 «Лаві момант» (16+).
7.00 «Раніца з гумарам» (16+).
10.45, 22.50 «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
12.00 «Гатуем як шэф» (16+).
12.30 «Дурні і дарогі» (16+).
13.25 «Галілеа» (12+).
13.50 Серыял «Апошні з Магікян» (16+).
14.45 Серыял «Госці з мінулага» (16+).
16.05 Серыял «Міша псуе ўсё» (16+).
17.00, 0.55 Серыял «90-я. Весела і гучна» (16+).
18.40 «Уральскія пельмені» (16+).
20.00 Серыял «Пастукай у мае дзверы» (16+).
21.00 Фантастыка «Перавага» (12+).
0.00 Серыял «Улётны экіпаж» (16+).
2.35 Серыял «Кадэцтва» (12+).
4.10 «Адна за ўсіх» (16+).
5.10 «6 кадраў» (16+).

Культура

6.30, 7.00, 7.30, 8.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.30 Навіны культуры.
6.35 «Пешшу...»
7.05 Рускі стыль.
7.35, 18.40 «Ісус Хрыстос. Жыццё і вучэнне» [СЦ].
8.25 Легенды сусветнага кіно.
8.55, 2.40 «Першыя ў свеце».
9.15 «Колер белага снегу». Маст. фільм [СЦ].
10.15 «Назіральнік».
11.10, 23.50 XX стагоддзе.
12.15 «Забытае рамяство».
12.30 «Продкі нашых продкаў».
13.15 «Першыя ў свеце».
13.30 «Абсалютны слых».
14.15 Больш, чым каханне [СЦ].
15.05 Навіны. Падрабязна. Тэатр.
15.20 Мая любоў — Расія! [СЦ]
15.45 «2 Вернік 2».
16.35 Колер часу.
16.50 65 гадоў Міхаілу Плятнёву. Дак. фільм.
17.40, 0.50 Міхаіл Плятнёў і Расійскі нацыянальны аркестр. Р. Вагнер і Р. Штраус.
19.45 «Галоўная роля».
20.05 «Почырк эпохі» [СЦ].
20.30 «Добрай ночы, малыя!»
20.45 «Масква слязам не верыць» — вялікая латарэя». Дак. фільм. [СЦ].
21.30 «Энігма. Герберт Блумстэт».
22.15 «Варта». Серыял.
23.00 «Даваенная асоба гісторыі». Серыял [СЦ].
1.50 «Плятнёў». Дак. фільм.

Настальгія

6.00 «Быў час» (16+).
7.05, 8.35, 9.40, 11.00, 14.20, 15.40, 17.00, 18.50, 20.45, 21.40, 23.00, 1.00, 2.45, 3.40, 5.00 Музычная настальгія (12+).
7.20 Маст. фільм «Год цяляці» (18+).
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Мінулы час» (12+).
10.00, 16.00, 22.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
12.00 «Спяем, сябры!» (12+)
13.00 Маст. фільм «Сустрэнемся на Таіці» (18+).
14.45 «Сядзі і глядзі» (18+).
18.00 «Эліта Краіны Саветаў» (16+).
19.20 Маст. фільм «Нага» (18+).
23.20 «Блеф-клуб» (18+).
0.00 «СевАлогія» (18+).
1.15 Маст. фільм «Іспанская актрыса для рускага міністра» (18+).

EuroSport 1

0.25, 18.30, 20.25, 23.55 Навіны (16+).
0.30, 10.30 Тэлечасопіс Discovery Golf (6+).
1.00, 4.00, 8.00 Снукер. Welsh Open (6+).
2.30, 6.00, 12.00, 13.00, 16.30, 21.30 Веласпорт. Тур Турцыі (16+).
3.15, 7.00, 14.50, 17.30, 23.00 Веласпорт. Тур Сіцыліі (16+).
9.30 Веласпорт. «Флэш Брабансан» (16+).
11.00, 20.30 Гольф. «Мастэрс» (6+).
18.35 Снукер. Turkish Masters (6+).

Кінакамедыя

1.30 Замуж на два дні (12+).
3.25 Выкідала (18+).
5.00 Кароль вечарынак-2 (16+).
6.45 Бландзінка ў законе-2 (12+).
8.35 Ноч у Роксберы (18+).
10.05 Забойны футбол (16+).
12.00 Сястрычка, дзейнічай (12+).
13.55 Мядовы месяц у Лас-Вегасе (16+).

15.40 Занадта крута для цябе (16+).
17.35 Бязлітасныя людзі (16+).
19.30 Чаму ён? (16+)
21.35 Каханне і іншыя непрыемнасці (16+).
23.20 Красуні ва ўцёках (16+).

ТБ3

6.00 Калекцыя «Беларусьфільма» (12+).
9.50 «Громавы» (16+).
10.40 «Улегцы» (12+).
11.10 «Поўня». Серыял (16+).
12.15 «Містычныя гісторыі» (16+).
13.10, 17.30 «Любоўная магія» (16+).
13.40, 18.05 «Старац» (16+).

14.40, 19.40, 3.15 «Сляпая» (16+).
15.35, 20.35, 4.05 «Варажбітка» (16+).
16.30 «Паляўнічыя на прывідаў» (16+).
21.30 «Сельскі дэтэктыў» (16+).
22.25 «З чаго пачынаецца Радзіма» (16+).
23.25 «Дзённік экстрасэнса» (16+).
0.20 «10 самых» (16+).
0.50 «Гладыятар» (16+).
4.30 «Суд ідзе». Серыял (16+).

ТБ1000

5.15, 5.55, 17.20, 18.10 Доктар Хаус (16+).
7.00 Лары Краўн (16+).

9.10 Форэст Гамп (12+).
11.40 Трансформеры: эпоха знішчэння (12+).
14.35 Трансформеры: апошні рыцар (12+).
19.00, 3.55 10 прычын маёй нянавісці (16+).
20.50 Выдатніца лёгкіх паводзін (16+).
22.25 Дрэнныя дзяўчаты (12+).
0.05 Неверагодны Халк (16+).
1.55 Капітан Філіпс (16+).

ТБ1000 Рускае кіно

7.00 Прыцягненне (12+).
9.40 Галоўны (6+).
11.40 Каралёў (12+).
13.45 Зорны розум (16+).

15.35 Цяжкасці выжывання (16+).
17.10, 17.35, 18.05, 18.30 Апошні з Магікян (12+).
19.00 Спадарожнік (16+).
20.55 Зацьменне (12+).
22.20 Пабочны эфект (16+).
0.00 Час першых (6+).
2.15 Населены востраў (12+).
4.10 Населены востраў: схватка (12+).

National Geographic

6.00 Навуковыя глупствы (16+).
6.25, 7.15 Неверагодны доктар Пол (16+).
8.05, 9.00 Інстынкт выжывання (16+).
9.55, 10.45 Аўта-SOS (16+).
11.40, 12.30, 16.50 Дзікі тунец (16+).
13.15, 14.05 Расследаванні авіякатастроф (16+).
14.55, 15.50, 1.55, 2.45 Марс (16+).
17.35 Еўропа з вышыні птушынага палёту (16+).
18.30, 5.05, 5.35 Гульні розуму (16+).
19.15 Тытанік (16+).
21.00, 21.50, 3.35 Славіць кантрабандыста (16+).
22.40, 23.35 Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
0.25, 1.10 Служба бяспекі аэрапорта (16+).
4.15 Найцяжэйшы ў свеце рамонт (16+).

Discovery

8.00, 13.55, 14.20, 14.50, 15.15, 15.45, 16.10, 7.35 Як гэта ўладкавана? (12+)
8.25, 11.10, 16.40, 22.10 Махінатары (12+).
9.20, 9.45, 20.20, 20.45 Багажныя войны (12+).
10.15, 10.40, 21.15, 21.40 Як гэта зроблена? (16+)
12.05 Пчаліны кароль (12+).
13.00 Голыя і напалоханыя (18+).
17.35 Вулічныя гонкі (16+).
18.30 Іржавая імперыя (12+).
19.25, 4.27 Вялікія брудныя гонкі (12+).
23.05, 0.55, 5.14, 6.48 Залатая ліхаманка (16+).
1.50, 2.15, 2.45, 3.10, 3.40, 4.04 Бітвы за кантэйнеры (12+).

У праграме магчымы змяненні. Перадрукоўка праграмы забаронена. [СЦ] – фільм транслюецца са скрытымі субцітрамі.

ПРАВІЛЫ І ВЫКЛЮЧЭННІ

...Правяраць тую скаргу мы ехалі на машыне, з самай раніцы і, можна сказаць, цэлай брыгадай: апроч мяне, два інспектары з аддзела па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю, адзін участковы і, вядома ж, кіроўца.

Той самай кампаніяй, на той самай машыне вярталіся назад. Цемра а шостай гадзіне стаяла амаль непраглядная! Ведама, зазімак: ні табе снегу на зямлі, ні месяца ў небе... А замест мёртвых з косамі — елкі векавыя каля дарогі стаяць.

У такіх умовах нам, пасажырам, заставалася хіба спаць ці носам кляваць, што, дарэчы, мы і рабілі, аж пакуль наш кіроўца, што называецца, не ўдарыў па тармазах (прычым рэзка!) — не спыніў машыну, бо... Вачам не паверылі: ледзь не пад коламі, метры за два, ляжаў... чалавек.

Мы ўсёй «брыгадай» выскачылі на дарогу і ўбачылі, што гэта мужчына — стараваты, таўставаты, п'яны. Паспрабавалі падняць, паставіць на ногі — пакуль трымалі, стаяў, па-сяброўску ўсміхаўся, нават рот адкрываў, каб нешта сказаць... Але ж варта было аслабіць падтрымку — тут жа аб'язджаў на зямлю, каціўся ў кювет...

Што заставалася маім спадарожнікам? Толькі лезці следам, даставаць, выкочваць, як тое бервяно, назад на дарогу, ставіць на ногі, потым адпускаць і зноў «лавіць» у кювеце...

— Хлопцы, з гэтага нічога не будзе, — прызнаў участковы. — Прыйдзецца завезці яго дадому, а то, крый бог, загіне... Я ведаю, з якой ён вёскі: вярсты з дзве адсюль.

Везці дык везці, але як? Пах ад дзядзькі (яшчэ мякка кажучы) непрыемны, машына і без яго паўнюткая...

Вырашылі, што п'янага павязуць кіроўца і ўчастковы, а мы ўтраіх, каб не змерзнуць, пойдзем пешкі.

Як надумалі, так зрабілі. Мы ідзём, можна сказаць, нічога не бачым, а вось песню чуем. Ці ўсё ж здаецца? Але ж усім траім...

Што называецца, ідзём на голас. Так і ёсць: нехта спявае... Сціхае... Спявае? Падыходзім бліжэй: на тым жа баку дарогі і таксама ўпоперак ляжыць другі мужчына — малады, худы, п'яны... Ледзь дыхае... І песня ўжо абарвалася...

Трэба нешта рабіць, ратаваць, але як? Машын на дарозе ніякіх — ні сустрэчных, ні спадарожных. І наша бог ведае дзе...

Мусіць, праўду кажуць, што Бог п'яніц любіць, толькі долі не дае: святло фар на дарозе! Нехта едзе!.. Замахалі рукамі, спынілі — хуткая дапамога!

— П'яных не падбіраем, — заяўляе з кабіны спахмурнелы шафёр.

А фельчар тым часам ужо схіляецца над хлопцам.

...Праз нейкі час мы рушылі далей. Я пры гэтым бэсціла ўсіх п'яніц, якім гарэлка даражэйшая за жыццё, здароўе, блізкіх. Мае спадарожнікі, як падалося, не вельмі слухалі — круцілі галовамі... Пытаюся, з чаго б? «Ды, — кажуць, — не можа быць, каб гэтыя двое ўдвух пілі. Не па правілах гэта... Недзе павінен быць трэці».

...Той раз мы яго не знайшлі. Трэба разумець, не было?

Ірына Сядова,

г. Пружаны.

КАМУ ШТО, А ГАЛОДНАМУ — ХЛЕБ

Алегу, аднаму з шасці маіх стрыечных братоў, хутка 50. У вёсцы жыве. Свой дом у яго з усімі выгодамі, сям'я, гаспадарка, з паўгектара зямлі, сад, нават сажалка з карасямі... Ён шмат працуе, добра жыве... Другую хату цяпер купляе. «Яна табе трэба?» — здзівіліся мы. А брат давай разважаць: маўляў, тая хата — па суседстве, можна сказаць, пад самымі вокнамі, недарагая, нестарая... Невялікі рамонт сваімі рукамі зрабіў і гатоваe, жытло ці лецішча — хоць для малодшай дачкі (ёй 18), хоць для большага сына (яму 25). Пытаем: «А раптам ім не спатрэбіцца?» Алег у адказ: «А раптам спатрэбіцца — і няма?»

Жалезны аргумент, праўда?

Але ж нам больш спадабаўся іншы. Маўляў, недарэмна кажуць, што на смачны кусок знойдзецца раток? «Гэта значыць, — кажа Алег, — што не куплю гэту хату я для сваіх дзяцей — купіць мясцовая гаспадарка для нейкіх чужых. І добра, як для добрых... А калі раптам не? Што тады рабіць?»

Як ні круці, а мае брат рацыю: чалавеку для шчасця і сапраўды мала згоды ва ўласнай хаце, трэба, каб яна была яшчэ і за «сценамі» — з тымі ж суседзямі, з іншымі людзьмі.

І гэта — не толькі пра Алега, не толькі пра асобныя сем'і, але і краіны. Прынамсі, мы некалі (ніякіх межаў не было!) свабодна ездзілі па былым Саюзе: Сочы, Масква, Ленінград, Тбілісі, Вільнюс, Рыга, Адэса... Дзе нас тады ні насіла! Адусюль прывозілі найлепшыя ўражанні, сувеніры, а наш дзядзька (бацька Алега) — яшчэ і вясёлую гісторыю. Гучала яна прыкладна так:

— Паездку ў Кіеў нам зладзіў прафкам і ўсё чын па чыне: аўтобус, кампанія, песні, экскурсіі... Пасля агляднай па горадзе — гадзіна вольнага часу, і мы — хто куды, як тыя мурашкі... Жанчыны — а іх у групе большасць — панесліся па крамах. Я пайшоў гуляць па Крашчаціку (гэта ў Кіеве галоўная вуліца). І, відаць, самая прыгожая... Направа там паглядзу — вачэй не адвесці! Налева — таксама цуд! Так бы, здаецца, і стаяў — любаваўся... А каб яшчэ і закурыў...

Паляпаў па кішэнях — цыгарэты канчаюцца. Толькі падумаў, што трэба было б купіць, — надпіс перад вачыма «Перакурня». Во, думаю, якія парадкі ў людзей! У нас, бывала, не знойдзеш месца, каб па чарцы з некім узяць (трэба ў кусты хавацца), а тут — калі ласка — для курцоў спецыяльнае памяшканне. Цыгарэты, мусіць, прадаюцца, столікі стаяць, побач з імі — мяккія крэслы. Можаш пасядзець, калі стаміўся, можаш з людзьмі пагутарыць... Дай, думаю, зайду, на свае вочы пагляджу... А заадно і курыва куплю, пасмалю ў ахвотку, бо калі яшчэ давядзецца...

Адчыняю дзверы, заходжу ў вестыбюль. Дымам там не пахне, а крэслы стаяць. І народу няма... Дзве шыльды перад вачыма. Я адразу зразумеў: там жаночая зала, а там — мужчынская... І навошта, падумаў: мы ж бы і разам маглі пасмаліць...

Пакуль разважаў, як лепей было б, малады чалавек (сімпатычны такі... у белым халаце) запрасіў зайсці, адразу спытаў: «Вас пагаліць ці пастрыгчы?»... А мне ж каб пакурыць...

Няёмка было ў гэтым прызнацца: сеў у крэсла — пастрыгся.

Потым, калі апынуўся на вуліцы, яшчэ раз глянуў на шыльду. Там, як аказалася, не «Перакурня», а «Перукарня» — гэта значыць, цырульня...

Кажуць, глухі не пачуе, дык прыдумае, сляпы недабачыць, дык... пастрыжэцца.

М. Гушча,

г. Магілёў.

«МАЛЮЙ»... І НІ АБ ЧЫМ НЕ ДУМАЙ?

Наш Багушэвіч праўду пісаў: «Чым-то дзеіцца на свеце, што не роўна дзеле Бог?..»

Гэта не толькі пра бедных ды багатых. Гэта яшчэ і пра жанчын. Я па сваіх знаёмых бачу: асобныя з іх маглі б нарадзіць ды выгадаваць хоць сямёра дзяцей, але не хочуць, а нехта і хацеў бы, але...

У маёй прыяцелькі Ніны толькі адна дачушка. Яна, як і ўсе малыя, прасіла некалі, каб купілі ёй браціка ці сястрычку. У бацькоў ніяк не атрымалася. А дачка тым часам падрасла. Можна было ўнукаў чакаць... Ніна казала: «Хоць сабе і ў «падоле»!»

Дзякуй богу, без яго абышлося: выйшла дзяўчына замуж, з'явіўся першынец. Бабуля, можна сказаць, на крылах лётала: як вольная часіна — то і да малога, паглядзець на яго, дачцэ дапамагчы...

Гаспадарку тады на мужа кідала, ведала, што ён справіцца. І спраўляўся ж, але...

На дварэ тады быў сакавік — хутка Вялікдзень... А таму перад чарговым сваім ад'ездам Ніна дастала з кладоўкі бляшанку з фарбай, сказала мужу, каб пафарбаваў падлогу ў спальні.

Косцю, шчыра кажучы, не хацелася, але ж пярэчыць сэнсу не мела. Ён паклікаў суседа, удвух з ім вынеслі мэблю.

Потым гаспадар ужо сам пахадзіў па той спальні з венікам, з мокрай анучай — «узброіўся» пэндзлем і нават парадаваўся. А што — жонка над каркам не стаіць, не камандуе, не павучае: «малюй» сабе і ні аб чым не думай.

Косця вось так і рабіў, прычым доўга: ён нават не заўважыў, як стала канчацца фарба, як дабраўся ў самы далёкі куток, дзе... ні табе дзвярэй, ні табе акна. Адно слова — пастка!

Тым часам на дварэ стала змяркацца. Скаціна была галодная. Косця, скруціўшыся ў куце, ужо прыкідваў, як правядзе гэту ноч (аб тым, што скажа Дора, стараўся не думаць). Пад лыжачкай смактала — з раніцы нічога не еў: хацеў найхутчэй зрабіць.

Першым нешта нядобрае заўважыў сусед: свінні хлеўчык разносяць... Косці нідзе не відаць. Ён у хату. Чуе:

— Э-э, хто там? Падайце вады!

— І як гэта ты? — здзівіўся сусед. — Хто ж цябе ў кут загнаў?

А распытаўшы ды падаўшы «палоннаму» вады, пазваніў Ніне...

— Мазгоў — як у курыцы! — бушавала тая з парога (зяць яе на машыне прымчаў). — Вось і сядзі ў тым куце, пакуль падлога не высахне! А я пайду скаціну карміць.

Косця ў адказ толькі вачыма лыпаў: разумеў, што вінаваты, што ўляпаўся. А вось ці навучыўся чаму?

Жыццё пакажа...

Галіна Нічыпаровіч,

в. Магільна, Уздзенскі раён.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Неасабісты суб'ектыў

Філасофія выжывання

Чаму можа навучыць чай з крапівы

ТЭЛЕФАНУЮ сяброўцы ў Берлін. Не бачыліся з-за ўсіх абмежаванняў ужо амаль тры гады, невядома калі пабачымся наступны раз. Добра, што ёсць інтэрнэт і месенджары, па якіх можна звязацца. Вось так проста — ідзеш сабе ўвечары з Каменнай Горкі на Сухарава і размаўляеш з чалавекам у кватэры на Шылерпраменадэ. «Як вы там, пасылку з прадуктамі збіраць не трэба?» — пытаюся ці то жартам, ці то ўсур'ёз. Не, адказвае, пакуль не трэба. На вялікую сям'ю купляе заўсёды ў запас, таму тыя самыя запасы алею ды цукру яшчэ ёсць. Да таго ж жывуць у турэцкім раёне, там шмат крам, уладальнікі якіх завозяць прадукты наўпрост з гістарычнай радзімы. Так, прадукты і астатнія тавары даражэюць, але яны гэтаму як мінімум не здзіўляюцца, бо ўсё да гэтага ішло яшчэ з часоў лакдаўну. Як думаюць выжываць далей? «Вось вырашылі, што трэба ачысціць падвал і купіць дзе-небудзь дроў. Пры любым раскладзе яны, хутчэй за ўсё, спатрэбяцца...» У іхняй кватэры ацяпленне газавае, але дом стары, там у адным пакоі ёсць абкладзеная кафляй спраўная печка. Калі што, будуць усёй сям'ёй грэцца там...

МЫ наўмысна не гаворым пра палітыку, пра тое, чаму так адбылося, што дзве самадастатковыя жанчыны ў XXI стагоддзі ў цэнтры Еўропы абмякоўваюць не сям'ю, касметыку або адпачынак, а цэны на алей і тое, дзе дастаць дровы. Мы жывём у зусім розных інфармацыйных плынях, і пасварыцца на роўным месцы з-за той ці іншай падзеі ці заявы — справа адной хвіліны. Мы абедзве дакладна гэта ведаем на прыкладзе многіх агульных знаёмых: калі найлепшыя сябры сталі ворагамі, калі дзеці сышлі з дому і спынілі ўсялякія зносіны з бацькамі з-за розных поглядаў на палітыку. Таму мы лепш пра гэта: «Памятаеш, як на другім курсе бегалі па Мінску ў пошуках хоць чаго-небудзь, купілі, выстаяўшы вялізную чаргу, два пачкі тварагу?» І мы ўжо са смехам згадваем, як меркавалі наляпіць з таго тварагу сырнікаў (каб больш было), паклалі яго ў імправізаваны халадзільнік пад акном у інтэрнацкім пакоі, а трэцяя наша сяброўка прыйшла галодная і, пакуль мы спалі, увесь гэты запас з'ела...

А яшчэ мы абедзве і сёння памятаем смак крапіўнага «чаю» — сапраўдны чай быў у 91-м раскошай нават у сталіцы, у аптэках усю сушаную траву, якая больш-менш падыходзіла да заваркі, таксама раскупілі. І мы куплялі там спрасаваныя брыкеты сухой крапівы і заварвалі яе як чай. Упрыкуску з чорным хлебам, намазаным маргарынам (масла таксама не было), гэта вечна галодным студэнтам здавалася такой смакатой! А яшчэ мы адзін на траіх куплялі такі модны заморскі «Снікерс», рэзалі яго на кавалачкі і елі павольна, каб расцягнуць задавальненне. А інфляцыя была такая, што ў пачатку месяца за стыпендыю можна было купіць дзесяць долараў, а пад канец за яе ж не набіралася і пяці, і таму мы, атрымаўшы тыя нешматлікія «зайчыкі», беглі хутчэй да абменніка, стаялі ў чарзе, каб памяняць іх на «баксы», якія цягам месяца пакрысе мянялі назад па іншым курсе і так неяк дацягвалі да наступнай стыпендыі, атрымаўшы якую зноў беглі ў чаргу да абменніка...

ДЛЯ нас, сямнаццаці-васямнаццацігадовых, гэта было не вельмі важна, бо, як і ўсе ў гэтым узросце, былі больш занятыя сабой — каханнем, вучобай, пошукам працы (ніхто не гарантаваў не пасля заканчэння вучобы)... А для нашых бацькоў і людзей за нас зусім не нашмат старэйшых, у каго былі малыя дзеткі і не было «падушкі бяспекі» ў выглядзе гаспадаркі ў вёсцы, тыя часы былі сапраўдным выпрабаваннем. Гэта пачынаеш разумець, калі сам становішся дарослым і маеш сваю сям'ю, як і тое, чаму нашы старэйшыя ў большасці сваёй такія «кансерватары» так баяцца страціць тое, што маюць сёння. З гадамі і сам становішся такім кансерватарам, бо чай з крапівы — гэта «прыкольна», калі табе васямнаццаць, а калі табе сорак восем — зусім наадварот, і каштаваць яго зноў не хочацца...

ДАЙШОЎШЫ да дома, не заходзячы ў пад'езд, каб не перарвалася сувязь, я стаяла пад дробным, зусім не вясновым халодным дажджом, і мы гаварылі, гаварылі... Пра тое, як цяжка патлумачыць усё гэта сённяшнім трыццаціпяцігадовым і малодшым, якія выраслі і прыйшлі ў дарослае жыццё ў зусім іншых, падобных на цяплічныя, умовах. Магчыма, каб яны штосьці зразумелі — больш важнае, чым тое, пра што пішуць у сацыяльных сетках, ім патрэбна перажыць падобнае. Але ж так не хочацца гэтага, бо мы ж усе жадаем, каб нашы дзеці жылі лепш, чым мы, праўда?.. А яны, маладыя, не разумеючы гэтага, не спрабуючы нават разумець, ляпнуўшы дзвярыма, сыходзяць з дому, бо бацька або маці не пагадзіліся з тым, што напісана ў сацыяльных сетках, выказалі сваё, уласнае меркаванне. І лічаць, што, ляпнуўшы і сышоўшы, яны зрабілі правільна, і перакананць у адваротным іх вельмі цяжка, хіба што само жыццё ўсё расставіць на свае месцы... Як ім патлумачыць, што нашмат хутчэй, чым глабальны, можа здарыцца канец свету асабісты, і тады ўсё астатняе, пра што так заўзята і смачна пішуць сацыяльныя сеткі, зусім перастане быць важным? Што выжывае (ва ўсіх сэнсах) у гэтай мітусні толькі спакойны чалавек, які аб'ектыўна, сваімі мазгамі, ацэньвае сітуацыю і здолеў захаваць нармальныя адносіны з уласнай сям'ёй і блізкімі людзьмі...

«...А ўсё астатняе мы перажывём, праўда?» — «Праўда». — «Дык, кажаш, пасылку пакуль не збіраць?» — «Не, пакуль не трэба...» Халодны дождж сціх, сіноптыкі назаўтра абяцалі пацяпленне. Вясна, як і ўсё, чаму належыць абавязкова прыйсці, абавязкова прыйдзе.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3**
Предмет аукциона	
Лот № 1. Месторасположение: **Гомельская обл., г. Гомель, ул. Севастопольская, 61/1**	
Здание конторы (350/С-161796, 629,1 кв. м). ***Сведения о земельном участке***: предоставлен Продавцу общ. пл. **0,0614** га на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания конторы (ограничения – водоохранная зона)	
Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 180 745,07 бел.руб.	
Лот № 2. Месторасположение: Гомельская обл., г. Гомель, пер. Севастопольский 1-й, 53	
1) Здание механизированной мойки, инв. номер 350/С-163612, общ. пл. 127,3 кв. м. Составные части: кирпичная пристройка, смотровая яма, очистные сооружения. **2) КПП стоянки автотранспорта,** инв. номер 350/С-163639, общ. пл. 53,2 кв. м. **3) Навес со смотровой ямой (мехмойка),** инв. номер 350/С-163641, 76 кв. м смот. яма. **4) Очистные замазученных и ливневых вод,** инв. номер 350/С-170152. Составные части: закрытый горизонтальный отстойник. **5) Дорожное покрытие,** инв. номер 350/С-170155. **6) Забор,** инв. номер 350/С-170153, общ. пл. 386 м. Составные части: 4 ограждения, ворота. **7) Тепловая сеть,** инв. номер 350/С-163618, протяж. 148,9 м. Составные части: каналы, 2 опоры, камера, колодец (1 шт.). **8) Производственный водопровод,** инв. номер 350/С-163611, 213,3 м. Составные части: 2 трубопровода напорных, колодец, камера (2 шт.). **9) Дождевая канализация,** инв. номер 350/С-163609, протяж. 234,3 м. Составные части: 4 трубопровода безнапорных, колодец, камера (13 шт.), дождеприёмник. ***Имущество, входящее в состав лота:*** **гидроциклон ГЦ- 15** (инв. № 3714), **устройства скребковые** (инв. № 3926, 3927)	
Сведения о земельном участке: предоставлен Продавцу общ. пл. **0,8989 га** на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения. Ограничения – водоохранная зона водных объектов	
Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 654 141,26 бел. руб.	
Лот № 3. Месторасположение: Гомельская обл., Речицкий р-н, Борщевский с/с, д. Александровка	
